ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
Менск, Пляц Воліі № 17, 2-шы паверх
Сакратар — № 478
Рэдактар — № 769
Кантора — № 211
Сэктара прамысловасьці — № 615
ТЭЛ.

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

У-6. "Савецкая Беларусь" Москва, Моховая, 6 Публичная библиотека СССР им. Ленина отд. обмен. адвіз экз.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 12 (3101)
ЧАЦЬВЕР
15 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Да раённых зьездаў саветаў

15-га студзеня праводзіцца скліканьне першых пасьля ліквідацыі акруг раённых зьездаў саветаў БССР. Умовы і абставіны, пры якіх скліканьне зараз раённыя зьезды саветаў, зусім іншыя, чым яны былі ў 1929 г. Да гэтага часу ўжо пасьпяхова выкананы і перавыкананы пляны першых двух год пяцігодкі. Ажыцьцяўляемыя тэмпы і дасягнутыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама энтузіязм і ініцыятыва рабочае клясы забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Разам з гэтым нашы посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва і шырокае на ўсіх фронтах наступленьне сацыялізму на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, пасьпяховае вырашэньне задач суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай падставе кулацтва, як клясы, выклікалі і выклікаюць упартае, шалёнае супраціўленьне клясавага ворага, які імкнецца сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, дыскрэдытаваць палітыку партыі і савецкай улады, скарыстаць у сваіх контррэвалюцыйных мэтах усе нашыя цяжкасьці. Усім вядома, як ворагі савецкай улады ў асобе Рамзіных, Кандрацьевых, беларускіх контррэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў—Лёсікаў, Ластоўскіх, Некрашэвічаў і інш.—вялі падпольную работу супроць дыктатуры пралетарыяту, вялі падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Капіталістычныя дзяржавы, якія зараз перажываюць глыбачайшы эканамічны крызіс і маюць выпякоючае адгэтуль пачуваньне беспрацоўе і асаблівае абвастрэньне супярэчнасьцяў, шукаюць выхаду з свайго цяжкага становішча ў вайне з Саюзам ССР.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне пад непасрэдным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі пяцігодкі ў чатыры гады, згуртаваньне вакол гэтага лёзунгу шырокіх мас працоўных, разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва, рашучае наступленьне сацыялізму на капіталістычныя элемэнты, ажыцьцяўленьне на справе лёзунга суцэльнае калектывізацыі і на гэтай аснове ліквідацыя кулацтва, як клясы, упартае супраціўленьне клясавага ворага, напружанае міжнароднае становішча—вось тыя асноўныя асаблівыя ўмовы і абставіны, у якіх скліканцца зараз раённыя зьезды саветаў.

У парадку дня раённых зьездаў саветаў ставяцца такія важныя пытаньні, як даклад Ураду БССР, справаздачы РВК, пэрспэктывы культурнага і гаспадарчага будаўніцтва ў раёне і раённы бюджэт на 1931 год, аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падрыхтоўцы да чарговай вясновай пасеўнай кампаніі, выбары раённага выканаўчага камітэту і выбары дэлегатаў на X Усебеларускі зьезд саветаў.

Вялізарныя задачы, якія стаяць перад раёнамі, пасьля ліквідацыі акруг, патрабуюць ад іх перабудовы ўсёй сваёй работы ў напрамку большай самастойнасьці і ўжываньня новых мэтадаў, ад раённых органаў патрабуюць напружанай работы ў ажыцьцяўленьні вялікіх тэмпаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. У сувязі з ліквідацыяй акруг раёны ператварыліся ў апорнае зьвяно сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Гэта патрабуе ад раёнаў больш цьвёрдага і чоткага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, палітыкі і мерапрыемстваў савецкай улады пры вырашэньні чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Важнейшым з важнейшых пытаньняў, якія стаяць на раённых зьездах, павінна быць справа сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі—калектывізацыя і бальшавіцкая вясновая сяўба.

Раённыя зьезды саветаў павінны будуць падрабязна абгаварваць усе вузлавыя пытаньні калектывізацыі і вясновай сяўбы, папулярызаваць дасягненьні і далейшыя задачы калгаснага руху; прыкладамі, фактамі і лічбамі да казаць перавагу калектыўнага вядзеньня сель.-гаспадаркі перад індывідуальным; асьвятліць задачы, пытаньні і становішча культурнага будаўніцтва вёскі, асабліва пытаньні ўсеагульнага навучаньня, абгаварыць і вырашыць задачы асноўных гаспадарча-палітычных кампаній, асабліва такіх, як хлебазагатоўкі, лесазагатоўкі, пасеўная кампанія, мабілізацыя сродкаў, ільназагатоўкі і г. д. Раённыя зьезды саветаў, пленумы гарадзкіх саветаў—павінны яшчэ больш мабілізаваць шырокія масы рабочых на змаганьне за высокія тэмпы работы сацыялістычнай прамысловасьці, яшчэ больш узьняць творчую ініцыятыву і актыўнасьць працоўных мас на пасьпяховае вырашэньне ўсіх задач па выкананьні пяцігодкі ў чатыры гады.

Справаздачы раённых выканаўчых камітэтаў павінны даць зьездам саветаў малюнак сацыялістычнага будаўніцтва ў раёне, посьпехаў і недахопаў у канкрэтнай працы, высьвятліць вялікія задачы сацыялістычнага будаўніцтва ў раёне на 1931 год—трэці рашаючы год пяцігодкі.

Аб вялікіх задачах будаўніцтва ў раёнах можна меркаваць па тэй праграме гаспадарчага і культурна-сацыяльнага будаўніцтва, якая вызначана ў кантрольных лічбах па мясновых (раённых) бюджэтах на 1931 год. Збор мясцовых бюджэтаў прадугледжвае па ўсіх галінах будаўніцтва значнае павялічэньне выдаткаў у параўнаньні з мінулым гаспадарчым годам. Так, на прамысловасьць у 1931 годзе па мясцовых бюджэтах запраектавана да выдаткаваньня 12.390 тысяч руб лёў замест 6.103 тысяч руб. у 1929-30 г.; на электрафікацыю 3.110 тыс. руб. замест 2.010 тыс. руб.; на сельскую гаспадарку—5.765 тыс. руб. замест 4.956 тыс. руб., на камунальную і жыльлёвую гаспадарку—15.875 тысяч рублёў, замест 12.347 тысяч руб., на дарожную гаспадарку—6.181 тыс. руб., замест 4.463 тыс. руб., на асьвету—60.634 тыс. руб. замест 36.132 тыс. руб., на ахову здароўя 13.112 тыс. руб., замест 9.816 тыс. руб. і г. д. Агульная сума мясцовых бюджэтаў на 1931 г. складае 145 млн. 600 тысяч руб. У мінулым жа 1929-30 г. было—92 млн. 220 тыс. руб. Рост бюджэту больш, чым на 50 процантаў сьведчыць аб тых вялізарных дасягненьнях і задачах, якія павінны ажыцьцяўляцца ў раёнах, аб той напружанай рабоце і тых вялікіх тэмпах, якія павінны забясьпечыць поўнае выкананьне камечных на бягучы год пляна сацыялістычнага будаўніцтва. Раённыя зьезды саветаў павінны прыняць захады да свячасовай падрыхтоўкі і выкананьня гэтых задач. У прыватнасьці, для выкананьня пляну па прамысловасьці неабходна зьвярнуць увагу на неадкладнае разгортваньне падрыхтоўчых работ да будаўнічага сэзону, зьніжэньне сабекошту будаўніцтва, павышэньне вытворчасьці працы і правільнае скарыстаньне рабочай сілы, фінансавую дысцыпліну як у вытворчасьці, гэтак і ў будаўніцтве, поўнае скарыстаньне існуючага абсталяваньня мясцовай прамысловасьці. Транспарт і дарожнае будаўніцтва павінны заняць увагу зьездаў як важнейшыя гаспадарчыя мерапрыемствы.

Для забясьпечаньня поўнага і пасьпяховага выкананьня намечаных пляноў неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на мабілізацыю сродкаў. Ня гледзячы на значнае павышэньне прыбыткаў насельніцтва, асабліва ў вёсцы, у 1929-30 г. мабілізацыя сродкаў насельніцтва праходзіла зусім нездавальняючымі тэмпамі. У выніку слабай работы ў гэтай галіне зьявілася недаступленьне грашовых сродкаў да тых разьмераў, якія былі вызначаны промфінпляном. Такое становішча з мабілізацыяй сродкаў насельніцтва на сацыялістычнае будаўніцтва павінна быць рашуча зьнішчана.

Раённыя зьезды павінны зьвярнуць увагу на свячасовы і поўны збор паёў і ўкладаў капэрацыі, зварот пазычак, прыцягненьне новых укладаў у ашчаджасы, распаўсюджваньне пазык, збор усіх абавязковых плацяжоў і інш. Узьнятая актыўнасьць рабочых мас выявіла рост сацыялістычных форм арганізацыі працы: сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, арганізацыю сустрэчных прамфінпляну і інш. Гэтыя мэтады работы павінны быць скарыстаны і пашыраны на ўсе галіны работы.

Як на адну з умоў посьпехаў у галіне прамысловасьці трэба зьвярнуць увагу на грамадзкае харчаваньне і рабочае забясьпечаньне. Гэтае пытаньне зьяўляецца адным з важнейшых палітычна-эканамічных праблем у 1931 г. Таму неабходна забясьпечыць поўнае выкананьне плянавых заданьняў разгортваньня прыгарадных гаспадарак, малочных фэрм, арцеляй і сьвінаадкормачных пунктаў, арганізацыю рабочых сталовак на прадпрыемствах, закрытых разьмеркавальнікаў і г. д.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі шляхам яе калектывізацыі мае ў БССР агромністыя дасягненьні. Да канца 1930 г. у калгасы ўвайшло звыш 100 тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак супроць 25.830 гаспадарак на кастрычнік 1929 г., што складае каля 14 процантаў калектывізаваных гаспадарак супроць 3,8 проц. на гэты час у 1929 г. За гэты-ж пэрыяд пасеўная плошча сацыялістычнага сэктару павялічылася ў 7 раз і складае каля 17 процантаў усёй плошчы супроць 2,4 проц. у 1929 г., або 606.562 га супроць 82.600 га у 1929 годзе. Абагуленае стада прадукцыйнай жывёлы павялічылася з 20.962 да 120.000 галоў. Сацыялістычны сэктар ужо зараз дае дзяржаве каля 30 проц. таварнай прадукцыі да ўсяе сельскай гаспадаркі.

Прыведзеныя кароткія даведкі аб калгасным будаўніцтве красамоўна сьведчаць аб тым, што адзіна правільная зьяўляецца генэральная лінія партыі, яе Ленінская ЦК, сьведчаць аб тым, наколькі хлусьлівыя былі сьцьверджаньні апартуністых, што ў калгасах ня будзе стымулю да падвышэньня вытворчасьці працы, што ў выніку калектывізацыі мы будзем мець значны недасеў і г. д. Вялікая і яскравая перамога калектыўных форм сельскай гаспадаркі выклікалі новы прыліў у калгасы бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Толькі у кастрычніку 1930 г. у калгасы ўвайшло 4.954 новыя гаспадаркі і арганізавана 157 новых калгасаў. У справе разгортваньня калгаснага руху значна дапамагалі і дапамагаюць рабочыя брыгады і рабочае шэфства. Бядняцка-серадняцкія масы паслалі ў гарады тысячы чырвоных абозаў з прадуктамі харчаваньня і сыравіны для прамысловых цэнтраў. Гэта сьведчыць аб узмацненьні саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго ленінскай партыі.

Абгаварваючы важнейшыя пытаньні калектывізацыі, раённыя зьезды саветаў павінны ўзяць рашучы напрамак на заканчэньне ў асноўным да канца пяцігодкі калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, захоўваючы прынцыпы добраахвотнасьці, бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам, арганізацыі груп беднаты, правільнага ажыцьцяўленьня Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў будаўніцтве калгасаў, гаспадарчага і культурнага замацаваньня нацыянальных калгасаў.

Разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў БССР зьяўляецца адным з важнейшых задач у сельскай гаспадарцы, чаму пляны ў галіне жывёлагадоўлі павінны быць выкананы і перавыкананы. Пры гэтым праблема жывёлагадоўлі павінна быць шчыльна зьвязана з вырашэньнем кармавой базы. З гэтай прычыны трэба зьвярнуць выключную ўвагу на грунтоўнае палепшаньне і пашырэньне існуючай кармовай базы шляхам расчыстак і палепшаньня сенажацяй, пераворваньня сухадолаў з нізкімі ўраджаямі і інш. Сіласаваньне, пляны якога ў 1930 годзе былі амаль сарваны няўважлівымі адносінамі і несвячасовай падрыхтоўчай работай, павінна быць выкананa поўнасьцю па вызначаных плянах у бягучым годзе.

Ажыцьцяўленьне Ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР, асабліва зараз, у сувязі з выкрыцьцём групы контррэвалюцыйных беларускіх нацдэмаў, патрабуюць да сябе выключнай увагі. Дасягненьні і задачы ў галіне беларусізацыі, палепшаньне абслугоўваньня нацмен з пункту гледжаньня ажыцьцяўленьня рашэньняў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б павінны заняць адпаведнае месца ў працы раённых зьездаў саветаў.

Выкананьне раёнамі ўсіх вялізарных задач, якія стаяць перад імі, магчыма толькі пры ўмацаваньні раённых выканаўчых камітэтаў, пры забясьпечаньні іх адпаведным складам з моцных вытрыманых працаўнікоў, якія правільна па бальшавіцку чотка праводзяць у сваёй рабоце генэральную лінію партыі. Пытаньне выбараў раённых выканаўчых камітэтаў ёсьць важнейшае пытаньне раённых зьездаў саветаў. Тут не павінна быць месца ка зённаму, бюракратычнаму фармалізму і абыячасьці да таго, хто будзе абран у РВК. Трэба памятаць, што новы склад раённых выканаўчых камітэтаў, як і саміх саветаў, павінен быць здольным безагаворачна з бальшавіцкай непрымірымасьцю выканаць на справе стаячыя перад раёнамі задачы.

На падставе генэральнай лініі партыі райвыканкомы, а пад іх кіраўніцтвам і сельсаветы павінны забясьпечыць у далейшай працы бязумоўнае правядзеньне Ленінскай лініі партыі, вядучы рашучую барацьбу ў сваёй практычнай дзейнасьці з праяўленьнямі права і «лева» апартуністычных скажэньняў палітыкі партыі і мерапрыемстваў кіруючых органаў савецкай улады.

Такія важнейшыя задачы раённых зьездаў саветаў.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Ленінскія дні правесьці пад знакам мабілізацыі мас на выкананьне і перавыкананьне 3 рашаючага году пяцігодкі

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да правядзеньня Ленінскіх дзён

1. Падрыхтоўку да Ленінскіх дзён разгарнуць, як масавую палітычную кампанію, якую правесьці пад знакам мабілізацыі мас на выкананьне і перавыкананьне рашаючага 3-га году пяцігодкі, узмацненьне абароназдольнасьці краіны, асьвятленьне барацьбы партыі Леніна за пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі і арганізацыі мас на далейшае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

Партарганізацыі павінны скарыстаць масавую работу ў час Ленінскіх дзён для ўпагненьня ў партыю Леніна лепшых ударнікаў, рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднякоў.

2. Шырока папулярызуючы пастановы Сьнежаньскага Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), завастрыць увагу рабочых заводаў, фабрык, саўгасаў і калгасьнікаў на пасьпяховае выкананьне пляну 3-га году пяцігодкі з тым, каб на аснове магутнага вытворчага ўздыму арганізоўваць ленінскія ўдарныя брыгады і разгортваць усе іншыя формы сацспаборніцтва.

3. Шляхам масавай растлумачальнай работы падкрэсьліць ролю Уладзімера Ільліча Леніна ў барацьбе за нацыянальную палітыку пралетарыяту. Растлумачэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі ўвязаць в барацьбой КП(б)Б з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, беларускім контр-рэвалюцыйным нац.-дэмакратызмам і шовінізмамі іншых нацыянальнасьцяй.

4. На ўсіх прадпрыемствах, ва ўсіх калгасах, саўгасах і вёсках правесьці ў часе Ленінскіх дзён гутаркі, даклады, 21-га студзеня правесьці жалобныя сходы, прысьвечаныя сёмай гадавіне сьмерці Ул. Іл. Леніна.

5. Даручыць ЦСПСБ, НКА, даць паказаньні хатам-чытальням, клюбам, чырвоным кутком, бібліятэкам і школам аб пастаноўцы спэцыяльных вечароў, правядзеньня гутарак, дакладаў арганізацыі спэцыяльных куткоў Леніна.

6. Даручыць БДВ прыняць захады да распаўсюджваньня Ленінскай літаратуры сярод шырокіх працоўных мас.

7. Беддзяржкіно забясьпечыць кінотэатры, рабочыя клюбы і кіно-перасоўкі адпаведнымі кіно-фільмамі.

8. Радыёпэрэдачу правесьці цыкль дакладаў у часе Ленінскіх дзён па радыё і наладзіць пераклічку прадпрыемстваў па падрыхтоўцы да Ленінскіх дзён.

9. Культпрогу ЦК даць паказаньні аб прапрацоўцы гадавіны сьмерці Ул. Іл. Леніна ў партыйных школах.

10. Музэю Рэвалюцыі арганізаваць выстаўку, а таксама дапамагчы рабочым клюбам і Беддзяржкіно ў арганізацыі ленінскіх выставак на прадпрыемствах і ў буйнейшых тэатрах.

11. Газэтам, цэнтральным, раённым і шматтыражкам пастаўціць асьвятленьне задач Ленінскіх дзён і шырока папулярызаваць ролю Ул. Іл. Леніна ў барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю.

12. Правядзеньне Ленінскіх дзён увязаць з 25-ці годзьдзем Рэвалюцыі 1905 г., высьвятляючы ролю Леніна ў гэтай рэвалюцыі.

Памяці барацьбітоў

(Да 12-ай гадавіны са дню зьверскага забойства К. Лібкнэхта і Р. Люксэмбург)

Роўна 12 год таму назад—15 студзеня 1918 году міжнародная буржуазія вырвала з баявых радоў міжнароднага пралетарыяту адданых барацьбітоў за справу рабочае клясы—Карла Лібкнэхта і Розу Люксэмбург. Па ўказцы сацыял-дэмакратычнага ўраду Эбэрта-Шэйдэмана, пад кіраўніцтвам крывавай сабакі, сацыял-дэмакрата Густава Носкэ была зроблена гэтая зьверская расправа над Карлам і Розай.

Так быў абязглаўлены рэвалюцыйны рух Нямеччыны. Зьверскім забойствам Карла і Розы міжнародная сацыял-дэмакратыя паклала пачатак актыўнага адкрытага наступу на рэвалюцыйны пралетарыят, які пад кіраўніцтвам баявога «Спартака» у 1918 годзе выступіў у барацьбу за савецкую ўладу, за дыктатуру пралетарыяту.

Тав. КАРЛ ЛІБКНЭХТ

12 год таму назад Нямеччына пылала ў агні рэвалюцыйных баёў. Рабочыя Нямеччыны ўпяршыню пасьля крывавага шавіністычнага чаду—вайны, выступілі на барацьбу супроць імпэрыялізму. «Спартак», арганізатарам якога быў Лібкнэхт—рэвалюцыйная арганізацыя рабочае клясы Нямеччыны—ня быў масавай партыяй, ён павёў масу ў бой, але ня змог прывесьці іх да перамогі.

За гэтыя 12 год, пасьля таго, як была задушана нямецкая рэвалюцыя, міжнародная сацыял-дэмакратыя на справе давяла тое, што яна зьяўляецца верным лёкаем буржуазіі, што яна заўсёды гатова не за страх, а за сумленьне працаваць на карысьць капіталу. Верная традыцыям Носкэ і Шэйдэмана, нямецкая сацыял-дэмакратыя ўсё больш і больш становіцца на шлях крывавага тэрору супроць пралетарыяту. Растрэлы першамайскіх дэманстрацый на вуліцах Бэрліну, закон аб ахове рэспублікі, масавыя арышты рабочых—усе гэта праводзіцца пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле сацыял-дэмакратыі, якая перарасла ў сацыял-фашызм. Вырас вялізарны сацыял-фашысцкі дзяржаўны апарат в дзясяткам тысяч чыноўнікаў—сацыял-дэмакратаў, якія «добра-сумленна» выконваюць клясавы заказ буржуазіі.

Вогненыя заклікі Карла і Розы жывуць у сэрцах шматмільённага нямецкага пралетарыяту, які пад кіраўніцтвам КП Нямеччыны, вядзе ўпартую барацьбу супроць імпэрыялістычнага прыгнечаньня, за дыктатуру пралетарыяту. Грозныя раскаты сусьветнага эканамічнага крызісу ўжо ўсьпінаюць мільённыя працоўныя масы на рашучую барацьбу за канчатковае свае вызваленьне. Упартая барацьба Рурскіх капальнікаў, якая ідзе пад кіраўніцтвам КП Нямеччыны, зьяўляецца яскравым прыкладам таго, што барацьба за сусьветны Кастрычнік штодзень ўзмацняецца і пашыраецца, што ў яе ўцягваюцца новыя пласты пралетарыяту.

Расьце і мацнее рэвалюцыйны рух, які ахапіў сабой ня толькі капіталістычную Эўропу, ПАЗШ, але і далёкія прычнечаныя калёніі. Уваскрасае заканаваная сіла рэвалюцыі, якая ня пагібель сусьветнай буржуазіі. Міжнародная буржуазія пры дапамозе сацыял-фашыстаў усімі сродкамі душыць рэвалюцыйны пралетарыят. Рабочая клясa ў барацьбе з капіталам з кожным разам усе больш і больш пераконваецца ў тым, што сацыял-дэмакратыя—вораг пралетарыяту, што адзіным кіраўніком і арганізатарам клясавых баёў зьяўляецца—КП Нямеччыны, якая верна рэвалюцыйным традыцыям баявога саюзу «Спартак», на фундамэнце якога яна ўзрасла і ўзмацніла ся і вядзе баявыя рабочыя калёны ў бой з капіталам.

Тав. РОЗА ЛЮКСЭМБУРГ

Набліжаюцца дні, калі паўстаўшы пралетарыят, на чале з нямецкімі камуністамі паставіць крывавых сабак—забойцаў Карла і Розы ля сьцяны.

Карл і Роза—сымбаль барацьбы пралетарыяту Нямеччыны за канчатковую перамогу пралетарскай рэвалюцыі.

Я. М.

Падрыхтоўкой да ўсесаюзнай нарады

яшчэ больш мабілізуем рабселькораў на рашучае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі

Бабруйск рыхтуецца да нарады

АД НАШАГА БАБРУЙСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Пачалася падрыхтоўка да Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады. У парадку падрыхтоўкі да нарады праводзіцца праверка работы ўдарных рабкораўскіх брыгад і брыгад рабкораўэнтузіястаў. Па прадпрыемствах праводзіцца зьлёты рабкораў, прысьвечаныя нарадзе. Правядзеньне гэтых зьлётаў мае на мэце дасканала выявіць становішча нізавога друку, кіраўніцтва рабкорамі і насьценгазэтамі з боку партыйных ячэек і раённай газэты «Камуніст», а таксама стварыць новыя ўдарныя рабкораўскія брыгады, разгарнуць збор рабкораўскіх прапаноў да нарады.

Правядзеньне першых зьлётаў (агульна-гарадзкога і па некаторых прадпрыемствах) яскрава паказалі, што да гэтага часу кіраўніцтва рабкораўскім рухам і рабкорамі, а таксама насьценгазэтамі ў непасрэдной рабоце на вытворчасьці праводзілася надзвычайна слаба як з боку раённай газэты «Камуніст», так і з боку партыйных ячэек. Па шэрагу прадпрыемстваў партыйныя ячэйкі нават не заслухоўваюць дакладаў аб рабоце рэдакцыйнай калегіі. Ня робіць гэтага нават і парткалектыў камбінату, які мае шматтыражную друкаваную газэту.

Падрыхтоўка да Ўсесаюзнай нарады перайшла на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва. Заслухаўшы паведамленьне аб выкліку віцебскіх рабкораў на лепшую падрыхтоўку да правядзеньня нарады бабруйскія рабкоры прынялі выклік віцебчан і заявілі, што яны абвяшчаюць сябе ўдарнікамі падрыхтоўкі.

Пачалася пераклічка паміж асьбнымі прадпрыемствамі. Рабкоры шчацінай фабрыкі выклікалі на правядзеньне лепшай падрыхтоўкі рабкоры заводу імя Адзарыха. Разгортваецца спаборніцтва і паміж іншымі прадпрыемствамі.

Але гэты ўздым рабкораўскай масы часта ўпіраецца ў цьвёрдалобасьць прафсаюзных арганізацый, якія сваімі паводзінамі зрываюць правядзеньне рабкораўскіх зьлётаў. Такі факт меў месца на камбінаваай фабрыцы. Гэты факт паказвае на цяперашнюю недаацэнку справы падрыхтоўкі да нарады з боку прафсаюзных арганізацый і на недаацэнку рабкораўскай працы наогул.

З гэтаю шкоднаю недаацэнкаю трэба рашуча змагацца.

Д. Аланскі.

Запамяталі пра работу сярод рабселькораў

У Велікаўскім раёне маюцца насьценгазэты, маюцца бязумоўна насьценкоры і карэспандэнты друкаваных газэт. Але райком партыі запамятаў ад тым, што неабходна работу сярод рабселькораў арганізаваць на барацьбу за генэральную лінію партыі.

Шмат разоў аб гэтым гаварылася, пісалася, райком партыі прызнаваў у гэтай галіне сваю недастатковую ўвагу і... далей справа ня рушылася.

Ужо амаль-што 7 месяцаў, як ня склікалася раённая нарада рабселькораў. Няма сталага вучоту рабселькораў.

Насьценгазэты па раёне і ў самым горадзе выходзяць нерэгулярна і ніхто імі ня кіруе. У горадзе маецца каля 20 насьценгазэт, але кожная рэдкалегія працуе па-свойму. З моманту Ўсебеларускага рабселькораўскага рэйду не склікаліся нарады рабселькораў гораду.

Невыпадковымі зьяўляюцца такія выпадкі, калі некаторыя рэдкалегіі прапускаюць такія допісы, якія супярэчаць генэральнай лініі партыі.

У насьценгазэце швейнай арцелі «Аб'яднаньне» зьмешчаны допіс аб ашчаджасе і мабілізацыі сродкаў, у якім аўтар дагаварыўся да таго, што неабходна зьбіраць грошы на «чорны» дзень (?). Справа з рэагаваньнем яшчэ горшая. Выпікі Ўсебеларускага рэйду не падштурхнулі тых, якія ня хочуць адказваць на заменкі. Яшчэ і цяпер па большасьці допісаў няма адказаў і рэагаваньня.

Х. Рэзьнікаў.

Не псаваць газэты

Вельмі часта ў Бярэзінскую паштовую кантору паступаюць спаргі з боку падпішчыкаў на прысылку газэт, якія ні ў якім разе нельга чытаць, бо яны прасаленыя, або прамочаныя. Ня гледзячы на складаньне актаў Бярэзінскай поштай, галавацялы з Нова-Барысаўскай пошты да гэтага часу працягваюць адпраўку газэт па-ранейшаму, без надзейнай упакоўкі.

Неабходна, каб райРСІ і Белкіраўніцтва сувязі прыняла рашучыя меры.

В. К.

Падрыхтоўка інтэрвэнцыі ідзе поўным ходам

БЭРЛІН. «Агентур Прэс» паведамляе, што 30-га студзеня ў Варшаву прыедзе адзін з дырэктароў французкага банку «Дэ-Пэі дзю Норд» у якасьці галоўнага прадстаўніка банку і фірмы «Шнэйдэр-Грэзо» для сканчэньня перагавораў, што ідуць у Варшаве, аб прадастаўленьні Польшчы пазыкі ў 1 мільярд франкаў, тэрмінам на 55 год. Пазыка зьвязана з заказамі Польшчы французкай прамысловасьці. Тэхнічная частка дагавору ўжо абгаворана.

Польшча мае намер зрабіць з Гдыні буйны вайсковы порт. Новыя чыгуначныя лініі ня толькі даюць магчымасьць выпампаваньня верхнясілезкага вугаля, але яўна прызначаны для чыста вайсковых мэтаў. Недалёка ад паўдзённай лініі знаходзіцца цытадэля Кракаў, дзе згрупаваны тэхнічны навейшы вайсковы рыштунак і дзе зна ходзіцца пяты корпус. Кракаў зьвязаны з Пшэмышлем (дзясяты корпус), Львовым (шосты корпус).

Новыя чыгуначныя лініі забясьпечваюць перакіданьне войска з гэтых раёнаў.

Афіцыйны вайсковы бюджэт Польшчы 1930-31 году складае 1/3 усяго бюджэту; фактычна—больш, бо, апроч вайсковага, іншыя міністэрствы маюць асыгнаваньні на вайсковыя мэты. Толькі па вылічэньнях газэты «Німеччына», польская рэгулярная армія разам з парубежным войскам налічвае 304.000 чал., на бюджэце—922.700 тысяч злотых з агульнага бюджэту ў 2.935 мільёнаў.

Апроч таго, у кожным ваяводзтве знаходзіцца «камісія па фізычным выхаваньні і вайскова-падрыхтоўцы», якая праводзіць падрыхтоўку моладзі.

Дзесяць мільярдаў рублёў—гадавы бюджэт інтэрвэнцыі

ЛЕНДАН. 11-І. «Сэндэй Экспрэс» прысьвечвае спэцыяльны артыкул пытаньню аб узбраеньнях. Газэта заяўляе, што наперакор усім сутыркам аб разбраеньні, наперакор скліканьню шматлікіх канфэрэнцый, сьвет не разбройваецца. Наадварот, за 12 год, што мінулі пасьля вайны, узброеньні ня толькі паменшыліся, але нават павялічыліся. Да вайны выдаткі на ўзбраеньне складалі 700 млн. фунтаў стэрлінгаў у год. Зараз-жа выдаткі на ўзбраеньне перавышаюць мільярд фунтаў стэрлінгаў у год.

Ня гледзячы на тое, што Англія зьменшыла танаж падводных лодак і крэйсэраў, сусьветны танаж значна павялічыўся. У 1913 годзе сусьветны танаж крэйсараў складаў 138 тысяч; цяпер ён складае 283 тысячы. У працягу апошніх шасьці год асабовы склад флёту 5 кіруючых дзяржаў павялічыўся на 12 тысяч чалавек. Такі-ж працэс наглядаецца ў арміях, прычым асабліва павялічыліся амэрыканская і італьянская армії. Выдаткі на паветраныя ўзбраеньні таксама хутка павялічваюцца ва ўсім сьвеце.

На катаргу

Прысуд над былымі дэпутатамі клюбу „Змаганьне"

ВАРШАВА, 13. Віленскі суд вынес прыгавор па справе былых дэпутатаў беларускага клюбу «Змаганьне». Чацьвёра былых дэпутатаў—Гаўрылік, Дварчанін, Крынчук і Вальнец прыгавораны да 8-мі год катаржнай турмы кожны. З шасьці астатніх падсудных трое прыгавораны да чатырох год і трое да двух год турмы.

Нават буржуазны друк падкрэсьлівае, што падсудныя трымалі сябе на судзе з выключнай годнасьцю. На пытаньні суда яны адказвалі на беларускай мове. На пытаньне аб вераспавяданьні, яны адказвалі—атэіст.

Абвінавачальны акт разглядае беларускі клюб «Змаганьне» як легальны філіал кампартыі Заходняй Беларусі. Перад пачаткам працэсу пракурор далучыў да справы камуністычны заклік, які распаўсюджваўся ў Вільні ў сувязі з працэсам.

У выглядзе рэчавых доказаў па справе ёсьць ілюструючыя пяцігодку плякаты, якія віселі ў памяшканьні дэпутатскага клюбу. У абвінавачальным акце падкрэсьліваецца, што гэтыя плякаты былі выданы ў Менску.

Будзем і надалей змагацца

за пяцігодку ў 4 гады, за выкананьне праграмы калектывізацыі

ЦК УсеКП(б), тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б

Пошты Усебеларускі зьлёт 25-ціцьсячнікаў, сабраўшыся для падагульненьня вынікаў гадовай працы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і абгаварэньня практычных задач па падрыхтоўцы і правядзеньню надыходзячай вясенняй пасеўкам пані, шле свае пралетарскае прывітаньне ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б) і тав. Сталіну.

Год таму назад, у адказ на заклік нашай партыі, мы дабраахвотна пашлі ад варштатаў сацыялістычных фабрык і заводаў у розныя куткі БССР на барацьбу за сацыялістычную перабудову гаспадаркі. Мы з энтузіязмам пашлі на работу туды, дзе асабліва мацна было супраціўленьне кулацтва ўсім мерапрыемствам партыі і савецкай улады. Мы пашлі, каб дабіцца канчатковай перамогі над нашымі клясавымі ворагамі на вёсцы і для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва калгасным рукам і бядняцка-сераднякамі кімі масамі сялянства.

Усямерна перадаючы вопыт сацыялістычнай арганізацыі працы сацыялістычнай прамысловасьці масам калгасьнікаў, мы ўнядраем мэтады сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва і актыўнай працы вытворчых нарад у калгасах.

Посьпехі, дасягнутыя пралетарыятам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў галіне індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Савецкага Саюзу, поўнасьцю аправергаюць усе прадказаньні правых апартуністаў аб непасільнасьці тэмпаў пашага сацыялістычнага будаўніцтва, гэтыя посьпехі моцна б'юць на правых і «левых» апартуністах, якія зьяўляюцца рупарам клясавага ворага.

Посьпехі, дасягнутыя намі ў справе кіраўніцтва даверанымі нам партыяй калгасамі яшчэ раз даказываюць няспасыць прадказаньняў правых апартуністых аб тым, што рабочыя фабрык і заводаў, незнаёмыя з сельскай гаспадаркай, не справяцца з працай у калгасах.

Мы абяцаем Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі, што і ў далейшай сваёй рабоце ўсямерна будзем змагацца за выкананьне праграмы калектывізацыі, за выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, які, бязумоўна, будзе годам завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР і БССР. Мы нашай работай забясьпечым новы ўздым вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы і мацнейшы зрух у справе разьвіцьця сацыялістычнай жывёл

Арганізацыю новага магутнага калгаснага прыліву

—У ЦЭНТР УВАГІ РАЁННЫХ ЗЬЕЗДАЎ САВЕТАЎ

„Адным са значных заваёў калгаснага руху зьяўляецца тое, што ён пасьпеў ужо высунуць тысячу арганізатараў, дзесяткі тысяч агітатараў калгаснай справы з саміх сялян“ (СТАЛІН)

Мабілізаваць актыўнасьць калгасьнікаў, беднаты, сераднякоў і працоўных жанчын на падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны, на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам і яго агентурай —правымі і „левымі“ апартуністамі

АДЗНАЧЫЦЬ ЛЕНІНСКІЯ ДНІ НОВЫМ МАГУТНЫМ УЗДЫМАМ КАЛГАСНАЙ ХВАЛІ

Пад сьцяг калгасаў

З ініцыятыўных груп—у калгасы

▲ У АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКІМ раёне ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў шырока разгарнулі работу. За другую палову лістапада і за сьнежань 10 ініцыятыўных груп перарасьлі ў калгасы. Арганізацыя ініцыятыўных груп працягваецца.

▲ У СЛУЦКІМ раёне тры ініцыятыўныя групы перарасьлі ў калгасы.

▲ У КАМАРЫНСКІМ раёне з трох ініцыятыўных груп арганізавана тры калгасы.

▲ Беднякі і сераднякі вёсак Дубіякі і Мардвілавічы, ЛЮБАНЬСКАГА раёну, арганізавалі тры ініцыятыўныя групы. Нядаўна гэтыя групы стварылі тры калгасы.

▲ У ЮРАВІЦКІМ раёне праведзена канфэрэнцыя ініцыятыўных груп і брыгад пры калгасах па абмену вопытам па калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Канфэрэнцыя знач на ажывіла работу ініцыятыўных груп і брыгад з калгасьнікаў па вярбоўцы аднаасобнікаў у калгасы.

▲ У ГОРАЦКІМ раёне 7 ініцыятыўных груп, якія досыць актыўна працавалі, перарасьлі ў калгасы. Цяпер разгортваецца работа па арганізацыі новых ініцыятыўных груп.

▲ Калгасьнікі-вярбоўшчыкі ЛОЕЎСКАГА раёну арганізавалі 12 ініцыятыўных груп, якія аб'ядноваць 158 гаспадарак. Арганізавана 7 новых калгасаў і 2 таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. Уноў арганізаваныя калгасы аб'ядноваць 200 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У існуючыя калгасы ўступіла 225 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

▲ 31 ініцыятыўная група на ПОЛАЧЧЫНЕ за кароткі час ўцягнула ў калгасы 149 аднаасобн. гаспадарак. Прыкладнымі з гэтых груп зьяўляюцца групы пры калгасах «Чырвоная Паляна», «Новае Жыцьцё», «Былы Хутаранін», «Чырвоная Беларусь», «Чырвоны Аратыя» і «Бальшавік».

▲ Пад кіраўніцтвам вопытнага 25-тысячніка—старшыні калгасу «Рухавік», УВАРАВІЦКАГА раёну, вярбовачныя камісіі растлумачылі аднаасобнікам-бедняком і серадняком вынікі сваёй работы, парадак разьмеркаваньня ўраджаю і прыбытку ў калгасе, пасьля чаго пачаўся значны прыліў у калгасы.

▲ Вярбоўшчыкі калгасу «Гром», БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА раёну, вядуць работу ў вёсцы Іванаўка па арганізацыі калгасу. У 12 вёсках вярбоўшчыкі гэтага калгасу правялі справаздачы калгасаў перад аднаасобнікамі, паказалі ім перавагі калектыўнай гаспадаркі, пасьля чаго ў вёсках Берастоўка, Васільеўка і Марозаўскія хутары арганізаваны ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў.

▲ Асобныя вярбовачныя камісіі ЛЕЗЬНЯНСКАГА раёну разгортваюць вялікую работу па калектывізацыі. Вярбовачная камісія аднаго з калгасаў за два дні завербавала ў свой калгас 17 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У калгас «Бязбожнік» падана 50 заяў. За апошнюю дэкаду арганізаваны новы калгас з 20 гаспадарак.

▲ У БЯРЭЗІНСКІМ раёне за апошні час у калгасы ЎСТУПІЛА 217 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК, з гэтай колькасьці беднякоў 55 і сераднякоў 162. Батракі ў раёне ўжо даўно поўнасьцю ахоплены калгасамі.

Папаўняюцца рады калгасьнікаў

7 новых калгасаў

На 1 кастрычніка 1930 г. па Вушацкім раёне налічвалася 18 калгасаў з лікам 827 гаспадарак. За апошні час арганізавалася яшчэ 7 калгасаў з колькасьцю 173 гаспадаркі. У час правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі арганізавалася яшчэ 5 калгасаў.

Наглядаецца прыліў у калгасы: за апошні час у калгасы ўступіла 120 гаспадарак. Актыўны ўдзел у арганізацыі калгасаў прымаюць Плінская і Завячольская ячэйкі КП(б)Б.

Вельмі марудным тэмпам калектывізуецца Веснецкі, Гаралзецкі і Жарскі сельсаветы, якія яшчэ не перабудаваліся на ўдарныя тэмпы работы.

Завячэльсні сельсавет ужо калектывізаваны на 77,4 проц. дзякуючы таму, што калгас «Чырвоная Полаччына» паказаў на практыцы сваю работу і дасягненьні. На апошнім сходзе гэтага калгасу 5 студзеня 1931 г. улілася ў калгас цалкам вёска Завяправа ў ліку 30 гаспадарак.

Дзякуючы добра пастаўленай работе ў калгасы «Чырвоны Ўсход» і «Чырвоны Кастрычнік» наглядаецца вялікі прыліў.

Грыдзюшка М.

Вушацкі раён.

Зразумелі выгады калектывізацыі

„Жыць на асобных гаспадарках няма ніякай рацыі“

Пасьля правядзеньня перавыбараў сельсавету, беднота і сераднякі в. Дамянікава і пас. Жураўкі, Бучацінскага сельсавету, зразумеўшы выгады калектыўнай гаспадаркі, на агульным сходзе пастанавілі арганізавацца ў калектыў. Усяго ўступіла ў калгас 11 гаспадарак, чакаецца яшчэ больш прыліў.

Многія сяляне гавораць, што да вясны яны ўступяць у калгас, бо жыць на асобных гаспадарках няма ніякай рацыі.

У калгас Войкава, таго-ж сельсавету, падана ўжо 5 заяў.

Ячэйцы КП(б)Б неабходна павесьці яшчэ больш шырокую растлумачальную работу сярод насельніцтва за ўступленьне ў калгасы.

Чырвона-Слабодзкі р. І. Хмель.

Завод і калгас—два фарпосты сацыялістычнага будаўніцтва

Шклозавод «Домбаль» і калгас «Дом баль»—два фарпосты сацыялістычнага будаўніцтва—па-бальшавіцку ажыцьцяўляюць і праводзяць у жыцьцё ідэю пралетарскага шэфства. Шэфства не на словах, не ў рэзалюцыях і пратаколах, а шырокае, масавае шэфства на справе.

Калі прыбыўшы рабочы заводу «Дом баль», брыгадзір Нікалаеў, расказаў калгасьнікам аб тым, што заводу патрэбны падводы для адгрузкі прадукцыі і іншых работ, калгасьнікі як адзін адгукнуліся на заклік рабочага:

— Як-жа, абавязкова дапаможам—заявілі калгасьнікі.—Вы дапамаглі нам у арганізацыі нашага калгасу, мы вам дапаможам у выкананьні прамфінпляну. Тут-жа некалькі чалавек паехалі працаваць на завод «Домбаль».

Калгас арганізаваўся летась, вясной. Сход сялян, які адбываўся ў часе арганізацыі калгасу, быў самы бурны з усіх сходаў у вёсцы Лозіна.

Цьвёрдае і бальшавіцкае кіраўніцтва з боку партячэйкі і сельсавету забясьпечылі рост і ўзмацненьне калгасу «Домбаль».

Лозінскія хутары і пасёлкі—спадчына царскай улады, панаваньня Сталыпіна—сьцягваюцца ў адзіны моцны калгас.

— Хутка мы ператворымся ў сельска-гаспадарчы камбінат,—заяўляюць калгасьнікі. Сапраўды—на ўсіх пунктах Лозінскага сельсавету арганізаваны падсобныя гаспадаркі.

Беднякі і сераднякі Лозінскага сельсавету пасьля справаздач аб выніках разьмеркаваньня ўраджаю, якія гавораць аб павялічэньні прыбытку калгасьніка ў параўнаньні з аднаасобнікам у два разы і больш, на справе ўпэўніліся ў перавагах буйнай сацыялістычнай гаспадаркі перад дробнай. У сьвядомасьці адсталай часткі прапоўнага сялянства рушацца апошнія надзеі і на сваю палоску, на жалобную мяжу.

Прыліў 47 новых гаспадарак—вось рэальныя вынікі ўзросшых сымпатый да калгасу, вось паказьнікі ўзросту аў гарытэту калгасу «Домбаль».

— Гэтыя ўжо не пакінуць калгас, яны цьвёрда прышлі ў калгас,—разважаюць паміж сабой калгасьнікі.

Шпаркім крокам набліжаецца Лозінскі сельсавет да суцэльнай калектывізацыі.

На куставой выстаўцы калгас атрымаў у якасьці прэміі малочны бак і дыплём першай ступені. Зараз калгас уключыўся ва Ўсебеларускі конкурс на лепшы калгас. Змагаемся за пераходны сьцяг, ёсьць усе шансы яго заваяваць.

Калгас «Домбаль» мае сьвінагадоўча-жывёлагадоўчы ўхіл. У справе культурнага вядзеньня гаспадаркі, у справе разьвіцьця буйнай жывёлагадоўлі перад калгасам стаіць вялікая праца, вялікае праяўленьне творчай ініцыятывы калгасьнікаў. Прапа гэта ўжо распачата: складзен плян севазвароту і зьведзены ў адно месца азімы клін, прыстасаваны памяшканьні для коняй, кароў і сьвіней. Завезены ўгнаеньні для вясновай сяўбы (суперфасфат, касьцяная і фасфарытная мука). Выкананы аграмінімум. Калгас у асеньнюю сяўбу павялічыў пасеўную плошчу на 6 проц. Пад зяб узорана 97 проц. На зімовы час распрацаваны нормы выпрацоўкі і даведзены да кожнага калгасьніка. У справе сіласаваньня Лозінскі калгас стаіць на першым месцы сярод астатніх калгасаў нашага раёну: ёсьць 3 сіласныя ямы ўмяшчаль насьцю ў 100 тон.

Пад кіраўніцтвам партячэйкі, пад кіраўніцтвам свайго шэф-заводу «Домбаль» калгас ідзе шпарка да новых дасягненьняў. Упартай працай ён заваёўвае пераходны сьцяг.

Ф. САЛАВЕЙЧЫК.

Барысаўскі раён.



Ачыстка абагуленага насеньня ў калгасе «Рашучы», Нараўлянскага р.

Жыцьцё галасуе за калгас

Сяляне многіх вёсак ужо ўсьвядомілі, што адзіны выхад—толькі ў калектывізацыі вёскі. У 1928 г. у в. Сыпышчава, Дубровенскага раёну, арганізавалася два калгасы, куды ўступіла 21 бядняцкая гаспадарка. Пачалі будаваць сваю гаспадарку па новаму. Спачатку ўсім здалося, што гэта зьява дзікая і непрыемная. Кулакі распаўсюджвалі розныя плёткі. У калгасах была яшчэ неарганізаванасьць, безгаспадарчасьць і розныя няўдачы.

Калгасьнікі хутка пераканаліся, што чым большая гаспадарка, тым лепш, і гэтыя два калгасы аб'ядналіся ў адзін «Новае жыцьцё». Дружная калектыўная праца ўсё перамагла.

Сёлета калгас «Новае жыцьцё» сапраўды паказаў, што беднята жыве па новаму і вядзе сваю гаспадарку па сацыялістычнаму. Пасьпяхова былі скончаны вясновая і асеньняя пасеўная кампаніі. Акуратна і своячасова была скончана ўборка сенажаці і ўраджаю. Лішкі хлеба здадзены дзяржаве. Цяпер сяляне гэтай вёскі і ўсіх суседніх вёсак на практыцы пераканаліся над перавагай калектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай. Цяпер аднаасобнікі не сьмяюцца з калгасьнікаў, а калгасьнікі пахвальваюцца сваімі посьпехамі перад аднаасобнікамі. Паміж калгасьнікамі і аднаасобнікамі існуюць самыя таварыскія ўзаемаадносіны.

Сёлета ў калгас «Новае жыцьцё» ўступіла 4 гаспадаркі і яшчэ многія думаюць уступіць. Усім надаелі шматлікавыя вузенькія палоскі з шырокімі межамі. Жыцьцё галасуе за поўнае іх зьнішчэньне і арганізацыю буйнай калектыўнай гаспадаркі. Сяляне суседняй вёскі Рудава-Зямянская, бачачы дасягненьні калгасу «Новае жыцьцё», арганізаваліся ў калгас.

М. Асот.

Дубровенскі р.

Растуць рады калгасьнікаў

За апошнія часы ў сувязі з правядзімымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі ўздымаецца новая хваля калгаснага прыліву. У калгас «Гігант» за некалькі дзён уступіла 17 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія ўжо абагулілі сваю маемасьць і разам з калгасьнікамі рыхтуюцца да веснавой сяўбы.

Па Юравіцкім сельсавеце за які-небудзь тыдзень у калгасы ўступіла каля 50 гаспадарак. Асабліва растуць калгасы «Ленінскі шлях» і «Кастрычнік», якія паставілі сваю работу на сапраўды бальшавіцкія рэйкі і карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод вакольнага бядняцка-серадняцкага насельніцтва.

Але, разам з гэтым, многія сельсаветы яшчэ ня ўмеюць падхопліваць і арганізоўваць гэтую калгасную хвалю, у выніку чаго калгасны рух у большасьці разгортваецца самацёкам.

Баз. Румянец.

Полацкі р.

МТС рыхтуюцца да вясны

Дружынай—у калгас

4 студзеня 1931 г. адбыўся агульны сход Дукорскай дабраахвотнай пажарнай дружыны імя Красіна. Апрача пытаньняў дружыны было пастаўлена пытаньне аб калгасным будаўніцтве. Пасьля дакладу сакратара партячэйкі т. Крапскага на пытаньні аб калгасным будаўніцтве выказваліся сяляне-аднаасобнікі і калгасьнікі. У сваёй прамове калгасьнік т. Родзька сказаў:

Калі я жыў на сваёй аднаасобнай гаспадарцы, дык намалочваў жыта 50 пудоў, а сёлета ягодна маіх рабочых дзён у калгасе я атрымаў 60 пудоў жыта, апрача гэтага атрымаў ярыны. Матар'яльнае становішча маёй сям'і сёлета , у параўнаньні з мінулым годам, палепшылася. Я заклікаю сялян аднаасобнікаў уступіць у калгас.

У выніку абгаварэньня пытаньня аб калгасным будаўніцтве сход пастанавіў:

1. Уноў абраному праўленьню пажарнай дружыны ў далейшым весьці сыстэматычную работу ў напрамку растлумачэньня сярод членаў дружыны, карысьці і выгады калектыўнай гаспадаркі.

2. Цалкам дружынаю падаць калектыўную заяву ў калгас імя 16 партызан з просьбаю залічыць у калгас; з гэтага дню лічыць пажарную дружыну, калгаснай дружынай.

Мядзьведзяў.

Сьмілавіцкі раён.

Прыкладнасьць калгаснае працы ўзьняла прыліў

За апошні час у Полацкім раёне пачаўся новы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. Прыкладнасьць калгасаў узварушыла новыя хвалі прыліву. Так, у Бельскім сельсавеце арганізаваўся калгас «Чырвоны Маяк» з 26 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Васільеўскім сельсавеце арганізаваліся 2 новыя калгасы—імя Дзям'яна Беднага і «Чырвон. Зорка». У Верхачынскім сельсавеце арганізаваўся калгас «Чырвоны Кастрычнік». У Дамінікоўскім сельсавеце арганізаваўся калгас імя Карла Маркса. У Шапілаўскім сельсавеце арганізаваўся калгас «Новыя Гараны». У Громаўскім сельсавеце арганізаваны калгас імя Райкому партыі. У Экімаўскім сельсавеце арганізаваўся калгас імя Першага зьезду калгасьнікаў. Арганізаваны калгас «Пяцігодка—у чатыры гады».

Апрача гэтага ў старыя калгасы ўлілося 150 бядняцка-серадняцкіх гаспадаран. Новыя калгасы па-ўдарнаму рыхтуюцца да вясны.

Мікола Яроменка.

Полацкі раён.

Насустрач вясьне

арганізуем хвалю калгаснага прыліву

У Кнорынскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, арганізаваны новыя калгасы ў вёсцы Мельна і ў в. Парэчча.

У Хоцімскім сельсавеце арганізаваўся калгас з 13 гаспадарак. Наглядаецца прыліў у калгас імя 1-га Мая і «Чырвоны Май». Па раёне ўступіла да 50 аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Апрача гэтага з кожным днём арганізуюцца новыя калгасы, уступаюць аднаасобныя гаспадаркі ў калгасы. У Сяргеяўскім сельсавеце арганізаваны два новыя калгасы—імя Варашылава з 33 гаспадарак і імя Будзённага з 13 гаспадарак. Таксама маецца значны прыліў у старыя калгасы.

Мніс.

Пухавіцкі раён.

Калгасныя пасядзелкі

Да канца пяцігодкі калектывізацыя СССР павінна быць у асноўным закончана. (Сталін).

Узмацніць сваю работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных жанчын, асабліва на вёсцы, па разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва. (З рэзалюцыі XVI зьезду ўсеКП(б).

Па першым маршруце савецкай эсафэты

Савецкая эстафэта набліжаецца да фінішу. На працягу двух апошніх тыдняў студзеня будуць праведзены раённыя зьезды саветаў.

Але і на сёньняшні дзень ёсьць што падагульваць, як станоўчае, ёсьць што адзначаць і папраўляць, як адмоўнае, ёсьць што ўдасканальваць і паглыбляць...

Фініш ня спыняе той вялізарнай масавай работы, якая была праведзена па маршрутах эстафэты, той работы, якая ажывіла мядзьведжыя куты Каралінчыны, якая ахапіла палову раёнаў БССР.

Брыгады калгасьнікаў, батракоў, беднякоў, сераднякоў, чырвонаармейцаў, чырвоных партызан, працоўных жанчын, культурных работнікаў не дарма прайшлі пад разгорнутымі сьцягамі бальшавіцкай самакрытыкі па асноўных галінах работы сельсаветаў.

Савецкі актыў глухіх вёсак не для таго разгарнуў вялізарную работу ў час перавыбараў саветаў, каб «скласьці зброю ў козлы», дасягнуўшы фінішу савецкай эстафэты.

Сёньня мы ставім у асяродак увагі першы маршрут эстафэты—«Саветы і калектывізацыя сельскай гаспадаркі». Даклады калгасаў на справаздачна-перавыбарчых сходах...

Брыгады савецкай эстафэты па праверцы работы калгасаў...

Брыгады калгасьнікаў правяраючыя работу сельсаветаў...

Сотні га зямлі ў калгасах, узнятых пад зяб «заўтрашнімі калгасьнікамі»...

Сотні коняй і плугоў калгасных, якія «ірвалі межы» ў заўтрашняга калгасьніка...

Калгасы на чале аднаасобнікаў у чырвоных абозах...

Вось асноўны сэнс той работы, якая праводзілася па маршруту № 1 эстафэты.

Вынікі гэтай работы—замацаваньне існуючых калгасаў, арганізацыя новых, уздым хвалі калгаснага прыліву.

А вось факты.

На палёх Дзьвіжаўскага калгасу (Каралінскі р.) у час Кастрычнікаўскіх сьвят арала пад зяб 30 плугоў дабраахвотнікаў-аднаасобнікаў.

Беднякі аднаасобнікі глухой вёскі Кармы (таго-ж раёну) арганізавалі талаку для дапамогі калгасу ў пабудове пуні. Дабраахвотнікі ў зімовую сьцюжу крылі дах калгаснай пуні да позьняга вечара.

Па адным Каралінскім раёне ў час перавыбараў саветаў было арганізавана дзесяць новых калгасаў.

Такія-ж факты зафіксаваны, як вынік савецкай эстафэты і па іншых раёнах. Так у Вушацкім раёне (Плінскі сельсавет) арганізован калгас у 58 гаспадарак.

А вось факт, які патрабуе асаблівай увагі... Брыгада вёскі Бекі (Каралінскі раён), вылучаная па першым маршруце эстафэты, «пераходзіць мяжу» і арганізуе разам з савецкім актывам вёскі Рудня (УССР) новы калгас з 29 гаспадарак.

Можна-б прывесьці тысячы фактаў, гаворачых аб тым, што хваля калектывізацыі расьце, што гэтаму дапамагае савецкая эстафэта.

Брыгады не дарма прайшлі па першым маршруце савецкай эстафэты.

Раённыя зьезды саветаў, да якіх прыстасаваны фінішы савецкай эстафэты ў раёнах, павінны яшчэ лепш арганізаваць, яшчэ больш паглыбіць і ўдасканаліць формы і мэтады той работы, якая праходзіць па маршруце № 1.

Набліжаецца веснавая сяўба. Падрыхтоўка да новай бальшавіцкай вясны, арганізацыя новага прыліву ў калгасы—вось тыя бліжэйшыя задачы, якія павінны даць асноўныя напрамкі і формы далейшай работы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі...

„Баба ня хоча ісьці“...

Расчыстка шляху па маршруце калектывізацыі, пракладка «шпал і рэяк» у напрамку бліжэйшай станцыі—«Вясна 25 процантаў калектывізацыі»,—вось тыя задачы, якія мы бярэмся вырашаць не адкладаючы ў доўгую скрыню, зараз, у зімовы адрэзак часу.

Перш за ўсё рашуча будзем змагацца з апартуністычным разьлікам на самацёк у гэтым пытаньні, памятаючы, што сакратарыят ЦК КП(б)Б у сваёй апошняй пастанове ставіць, як адну з асноўных задач пры правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў калгасах—«барацьбу з права-апартуністычнай практыкай, хвасьцізмам і стаўкай на самацёк у калгасным будаўніцтве».

Выбіраем зьвяно, за якое трэба грунтоўна ўзяцца. У выбары зьвяна рашаючай будзе наступная дырэктыва XVI зьезду ўсеКП(б).

«Зьезд абавязвае ўсе партыйныя, прафэсыянальныя, савецкія і іншыя арганізацыі ўзмацніць сваю работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных жанчын, асабліва на вёсцы, на разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва» (З рэзал. XVI зьезду ўсеКП(б).

Выбар гэтага зьвяна можна падмацаваць радам жывых, яскравых фактаў.

У вёсцы Дзьвіжкі (Каралінскага р.) нам трапілася скарыстаць два ліквпункты для правядзеньня папулярнай гутаркі пра контрэвалюцыянэраў з прампартыі і контрэвалюцыйную групу беларускіх нацдэмаў. Прысутнічала прыблізна ля сотні жанчын.

Абурэньнем спаткалі дэлегаткі і актывісткі жанчыны паведамленьне аб тым, што ў краіне саветаў доўгі час працавалі людзі, якія падрыхтоўвалі зварот зямлі абшарнікам, а фабрык і заводаў капіталістым.

На другі дзень 64 дзьвіжкаўскія жанчыны на чале з дэлегаткамі, пад чырвоным сьцягам, які несьлі дзьве старэнькія бабкі, арганізавана здавалі ільна-валакно каапэрацыі. Гэта быў належны адказ контрэвалюцыянэрам.

Гэта быў вынік усьведамленьня справы, вынік цярплівай растлумачальнай работы.

Але ці часта жанчынам здараецца слухаць такія простыя растлумачальныя тутаркі? Які з райкомаў можа пахваліцца, што ў яго жаночная работа не адсунута на задні плян? Затое-ж, будзьце ўпэўнены, што кулацкі агітпроп тутака зевака не дае...

У вёсцы Мядзьведным (Каралінскі раён) надзвычайна арганізавана праходзіў справаздачна - перавыбарчы сход. Каб прыцягнуць большую колькасьць жанчын-выбаршчыц на сход, брыгада савецкай эстафэты арганізавала пры дапамозе каапэрацыі аднадзённыя дзіцячыя ясьлі. У час самых перавыбараў, калі адна за другою пра вальваліся кулацкія кандыдатуры, пачуўся трывожны жаночы выгук. «Бабы, чаго вы тутака сядзіце?! У ясьлях пачадзелі ўсе дзеці і адно ўжо мёртвае»...

Сход пакінуў пакой і толькі тады зноў сабраўся, калі высьветлілася, што ніхто не пачадзеў, апрача таго кулака, які хацеў сарваць сход і для гэтага падбухторваў жанчын...

Можна прывесьці і яшчэ многа пры кладаў для таго, каб паказаць, што жанчына часта бывае паслухмянай зброяй у руках клясавага ворага, што гэтай зброяй кулак карыстаецца, каб парашкаджаць ажыцьцяўленьню задач сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

А спытайцеся вы ў бедняка, альбо серадняка, якія засталіся па-за калгасам,—чаму яны ня ідуць у калгас.

— Баба ня хоча—вось які будзе адказ у дзевяноста выпадках са ста.

Узяць жанчыну ў работу!

Зьвяно абрана.

У арганізацыі веснавога прыліву ў калгасы адным з асноўных зьвеньняў будзем лічыць работу сярод бяднячак і сераднячак—некалгасьніц.

Будзем бацца за гэтае зьвяно.

Але як?!

Сакратарыят ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі кіруючых органаў калгасаў дае дырэктыву:

«Падводзячы вынікі калектывізацыі, вынікі першага гаспадарчага году, скарыстоўваючы ўсе формы масавай работы для паказу дасягненьняў калгаснага руху і перавагі калектыўнай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай, партарганізацыі павінны разгарнуць бальшавіцкімі тэмпамі работу па мабілізацыі актыўнасьці калгасьнікаў, калгасьніц і аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў на замацаваньне дасягнутых посьпехаў у галіне калектывізацыі, па разгортваньні работы па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясеньняй сяўбы і ажыцьцяўленьня вытворчай праграмы, намечанай на 1931 год».

Гэтая дырэктыва ЦК КП(б)Б выходзіць з агульнай установкі на пашырэньне калгаснага руху, на арганізацыю новага прыліву ў калгасы ў час вясеньняй сяўбы.

Гэтая дырэктыва робіць упор на мабілізацыю актыўнасьці калгасьнікаў і калгасьніц і прапануе скарыстоўваць «усе формы масавай работы» для пасьпяховага ажыцьцяўленьня намечаных задач.

Выбар формы і мэтаду масавай работы мы сёньня ставім у асяродак увагі. Мэта ёсьць, асноўнае зьвяно знойдзена. Трэба ўмела падыйсьці і ўзяцца за гэтае зьвяно, каб за ім падаўся ўвесь ланцуг.

Ёсьць шмат форм масавай работы. І справаздачы калгасаў на сходах аднаасобнікаў, і папулярныя гутаркі аб перавагах калгасаў, і суправа ў час палявых работ калгасаў з аднаасобнымі гаспадаркамі, і вярбовачныя камісіі, і так званыя «сваты», і масавая літаратура, і спэктаклі, і кіно, і радыё. Усё гэта формы ў большай альбо меншай ступені масавай работы.

Але-ж сказаць, якая-небудзь з гэтых форм можа быць у поўнай меры выкарыстана ў зімовы час, гэта значыць быць аптымістам. Асабліва, калі ідзе гутарка аб глухіх вёсках якой-небудзь Мазыршчыны, аб вёсках рась кінутых на хутары... Тут замест спэктаклю сямейныя сцэны, замест кіно,—бялізна высокіх сьнегавых сувояў, замест радыё—завываньне завірухі ў коміне, ды трэск асмолаў пад «грамафонам» коміну...

А даклад? Гутарка?

А ці часта яны бываюць у закінутай вёсцы? Кожны-ж добра ведае, што такая работа праводзіцца ў нашых мядзьведжых кутках ад выпадку да выпадку.

Калі-ж гаварыць пра работу сярод жанчын, дык тут прыходзіцца з усёй адказнасьцю заявіць, што па-першае, гэты вучастак работы ў нас у загоне, а па-другое, што тутака на адных дакладах, асабліва на такіх, якія ня ўлічваюць нізкага ўзроўню разьвіцьця вясковай жанчыны,—далёка не заедзеш...

Вось чаму зараз мы так сур'ёзна ставім пытаньне выбару формы масавай работы сярод жанчын—бяднячак і сераднячак—некалгасьніц.

Арганізацыя бальшавіцкай вясны з новым прыліўам у калгасы, справа настолькі важная, што райкомы, партячэйкі, жанарганізатары, кіраўнікі дэлегацкіх пунктаў, камсамольскія ячэйкі, калгасьнікі і калгасьніцы павінны з дастатковай сур'ёзнасьцю аднесьціся да той формы масавай работы, якую мы будзем прапановаць. Такой формай мы лічым калгасныя пасядзелкі. Назва некалькі сьмешная, але ня ў назьве справа.

Што-ж такое калгасныя пасядзелкі?

Пасядзелкі проста—рэч старая. У доўгія зімовыя вечары, каб ня так каб весялей жужжала верацяно, каб гучней сьпявалася сумная песьня, каб доўгая заблытаная казка альбо вясёлы жарт выклікалі срэбны сьмех і разганялі смутак клапатлівага дню,—бралі свае кудзелі ды ішлі да суседкі пасядзелкі. Так было ў стары час. Такі звычай захаваўся і на сёньня... Прытулак для пасядзелак звычайна селянін ці самотная ўдава. У першым яўляе да пасядзелак вялікую чуласьць і ўсякімі мерамі скарыстоўвае іх у сваіх мэтах. Памыць костачкі таго ці іншага партыйца, альбо камсамольца, расказаць «навіну» пра непаладкі ў калгасе, змайстраваць казачку пра быт у калгасе з яйбогамі аб тым, што «сам бачыў» як у калгасе ўсе сьпяць пад аднэю дзяругаю, альбо сьвяткуюць сьвята «менка» жонак і мужыкоў,—гэта адна з характарных рысаў той мэтоды, якою карыстаецца клясавы вораг у барацьбе супроць новага быту, супроць сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Тут заваёўваюцца сымпатыі жанчын-выбаршчыц для кулацкіх кандыдатаў у савет, тут апрацоўваецца тактыка клясавай барацьбы, тут праводзіцца тонкая выхаваўчая работа...

Пасядзелкі папершае—кавалак быту. Адным сваім канцом яны ўрасьлі ў сям'ю, у сямейны быт, у яго абраднасьць і звычаі, другім канцом яны далёка ўваходзяць у жыцьцё грамады спрабуючы падмяніць сабою для жанчыны афіцыйныя грамадзкія сходы, кнігу, тазэту і нават школу, калі гаварыць пра пасядзелкі старога часу.

Пасядзелкі вельмі распаўсюджаная і надзвычайна жыцьцёвая форма масавай работы. Так і толькі так намераны мы глядзець на пасядзелкі, калі ўзьнімаем пытаньне пра калгасныя пасядзелкі, як форму масавай работы сярод жанчын—не калгасьніц, у зімовы час рыхтуючыся да другой бальшавіцкай вясны. Адкінем рашуча ў бок і тут разьлік жанчын калгасьніц зрабіць пасядзелкі сваімі калгаснымі пасядзелкамі. Вырвем з рук кулака гэтую форму масавай работы і прымусім яе служыць арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Як гэта зрабіць?

Райкомы, жанарганізатары, партячэйкі, камсамол будзьце на варце, але прымеце маю першую перасьцярогу—не зарэжце пасядзелак казённічынай. Вучэце калгасьніц і ў першую чаргу жанчын дэлегатак што рабіць і як рабіць, але ня ўбівайце іх актыўнасьці і самастойнасьці спробай падмяняць іх і як мага больш браць на сябе. Нічога—ні пасядзелак, ні карысьці, калі вы сваёй залішняй апекай і ўдзелам у пасядзелках ператворыце гэтую форму масавай работы в бытавой ў

УЗМАЦНІЦЬ РАЕН—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО САЦБУДАЎНІЦТВА НА ВЕСЦЫ

„Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам зьвярнуць выключную ўвагу на работу сельскіх саветаў—паварот іх да калгаснага будаўніцтва, прыняць рашучыя меры да сапраўднага ажыўленьня дзейнасьці іх сэкцый, камісій, дапамагаючы сельскім саветам у штодзённай практычнай рабоце шляхам выезду для інструктаваньня і работы ў сельскіх саветах адказных работнікаў раёну і забясьпечыць уплыў гораду над вёскай шляхам разгортваньня рабочага шэфства...“ (З пастановы III сэсіі ЦВК БССР)

РВК павінны забясьпечыць няўхільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі ва ўсёй савецкай рабоце

Сельсаветы павінны стаць баявымі штабамі калектывізацыі

Перавыбары сельсаветаў па Сьмілавіцкім раёне праходзяць пад лёзунгам далейшага ўздыму калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі сапраўды сталі тварам да калектывізацыі. У часе перавыбарчай кампаніі пашырыўся рух бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Па Драчкоўскім сельсавеце ў часе перавыбарчай кампаніі арганізаваны 2 новых калгасы «Батрак» і імя Будзённага, у якія ўступіла звыш 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У калгасы «Новы сьвет», «Рабочы», і «Пяцігодка» ўступіла 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Дукорскім сельсавеце арганізавана 2 новых калгасаў імя ЦВК БССР і імя X-га вьезду ЛКСМБ. У гэтыя калгасы ўступіла звыш 60 гаспадарак. Па радзе іншых сельсаветаў таксама ўзрастае хваля новых калгасаў.

Алесь Вясёлы.

Сьмілавіцкі раён.

***

За час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і падрыхтоўкі да яе, на Рафалаўскім сельсавеце, Магілёўскага раёну, арганізавана 7 новых калгасаў. Наглядаецца прыліў і ў існуючыя калгасы. (калгас імя «X-ці-годзьдзя БССР») і інш.

Геця Моллін.

Магілёўскі р.

***

Ня гледзячы на антыкалгасную агітацыю кулацтва ў часе перавыбарчай кампаніі, у в. Кляйнічах арганізаваны калгас з 17 бядняцкіх гаспадарак, а ў в. Башках—з 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. 11 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі ў існуючыя калгасы.

С. С.

Круглянскі раён.

***

У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў арганізаваны новыя калгасы ў в. Остуй і Каласоўшчына, Бабаўнянскага сельсавету. Наглядаецца прыліў у існуючыя калгасы.

Селькор М.

Копыскі раён.

***

У Негацінскім сельсавеце ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў арганізавана два новых калгасы, у якія ўступілі 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Трэба адзначыць, што сельсавет нічога не рабіў па арганізацыі гэтых калгасаў і праз галаву сельсавету ў час справаздачна-перавыбарчых сходаў пытаньне аб калектывізацыі ўзьняла сама беднота. Новы склад сельсавету павінен у далейшым падтрымаць і пашырыць гэты рух асноўных груп сялянства ў калгасы, па-бальшавіцку стаўшы на чале гэтага руху.

П. Б.

Бярэзінскі раён.

***

У в. Дубні, Чырвонадворскага сельсавету, у часе правядзеньня перавыбарчага сходу беднота і серадняк гэтай вёскі заявілі аб жаданьні арганізаваць у вёсцы калгас.

Тут-жа на сходзе падалі заявы ў калгас 9 бяднякоў і сераднякоў вёскі. Сход абраў ініцыятыўную групу па арганізацыі калгасу.

Трахім Дубаеўскі.

Старобінскі раён.

***

У адказ на контрэвалюцыйную дзейнасьць «промпартыі», групы беларускіх контрэвалюцыйных нацдэмаў і іншых контрэвалюцыянэраў і шкоднікаў па трох выбарчых вучастках Езерскага сельсавету арганізаваны новыя калгасы: у в. Сакалоўцы з 14 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у в. Рагаліна—з 30 гаспадарак і па Шароеўскім сельсавеце, у в. Шароекі—з 14 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Па гэтых трох вучастках вынесены пастановы выканаць цалкам пляны па загатоўках.

П.

Чэрыкаўскі раён.

***

Справаздачна-перавыбарчая кампанія сельскіх саветаў па БССР азначаецца новым магутным рухам беднаты і сераднякоў у калгасы.

Савецкая эстафэта «Савецкай Беларусі», прысьвечаная справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, адыграла вялізарную ролю і ў пашырэньні калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У выніку ўсяго гэтага колькасьць новых калгасаў за час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў значна павялічылася.

Новаабраныя сельсаветы ў сваёй практычнай дзейнасьці павінны замацаваць дасягнутыя посьпехі ў калектывізацыі, стаць на чале гэтага руху бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі, усямерна ўзмацніць і пашырыць яго.

Трэба рашуча змагацца з маючай яшчэ дагэтуль месца ў радзе сельсаветаў правапартыйнічнай стаўкай на самацёк у калектывізацыі, трэба рашуча ўдарыць і па «левых» перагібах, якія сустракаюцца ў гэтай рабоце.

Сельсаветы ў сваёй практычнай рабоце павінны стаць сапраўднымі праваднікамі генэральнай лініі партыі. Стаць баявымі штабамі калектывізацыі.

У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў у Сушонскім сельсавеце, Вульскага раёну, арганізавана чатыры новых калгасы. Наглядаецца шырокі прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя калгасы.

Апроч таго, у часе перавыбараў саветаў арганізавана тры ячэйкі ТДА-Авіяхэму. Праведзены суботнік па загатоўцы каменьня і сабраныя гроші праведзены на абарону СССР. 5 калгасаў сабралі на пабудову дырыжабля «Калгасьнік» 276 рублёў і праведзены збор хлеба. Калгасьнікі заявілі: даём наш хлеб на наш дырыжабль.

Чарэцкі.

Вульскі раён.

***

У Падгайцаўскім сельсавеце ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі арганізаваўся новы калгас. У калгас уступіла 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Шклоўскі р. К. М.

***

Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў па Сьміловіцкім раёне ператварылася ў кампанію арганізацыі новых калгасаў і прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. 35 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, в. Жораўка, Дукорскага сельсавету, аб'ядналіся ў калгас. Мясцовы калгас імя 16 партызан» пададзены новыя заявы аб уступленьні. У раёне наглядаецца масавы прыліў і арганізацыя новых калгасаў і па іншых сельсаветах.

Алесь Вясёлы.

Сьмілавіцкі раён.

***

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ў Полацкім раёне прайшла пад лёзунгам узмацненьня калгаснага руху. У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі, у Баярскім сельсавеце 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі заявы аб уступленьні ў калгас. У Юравіцкім сельсавеце арганізаваўся новы калгас пад назвай «Наш адказ інтэрвэнтам», з 15 бедняцка-серадняцкіх гаспадарак. У Махіраўскім сельсавеце падана 15 заяў у калгасы.

Мікола Яроменка.

Полацкі раён.

Праверка работы сельсавету

Брыгады, арганізаваныя савецкай эстафэтай для праверкі работы сельсаветаў, выявілі шмат недахопаў у рабоце некаторых сельсаветаў і камісій па загатоўках.

У в. Дзьвіжкі, Рамязоўскага сельсавету член сельсавету Семяненка Варка замест актыўнага ўдзелу ў загатоўках бульбы і інш. адгаворвала сялян у сваім вучастку здавацьь бульбу і сама замест 50 п. здала толькі 20 пуд. Член сельсавету Цімошанка А. хаваўся і ня прымаў ніякага ўдзелу ў рабоце с-с.

Каралінскі р-н. С. Ф.

На другім этапе выбарчай кампаніі
(Да раённых зьездаў саветаў)

З найвялікшым уздымам, пры вялізарнай актыўнасьці ўсіх выбаршчыкаў і ў першую чаргу рабочых, калгасьнікаў і беднаты мы закончылі першы этап выбарчай кампаніі ў БССР—перавыбары сельскіх саветаў. Наперакор правым і «левым» апартуністам, наперакор дэмагагічна - правакацыйным сьцьверджаньням беспрынцыпнага права-«левацкага» блёку адносна таго, нібы ў нашай краіне «наглядаецца нейкі заняпад энэргіі, амаль што прастрацыя, адсутнасьць ініцыятывы»,—перавыбары сельскіх саветаў абярнуліся ў магутную дэманстрацыю адданасьці генэральнай лініі партыі з боку працоўных вёскі, гатоўнасьці з усіх сіл змагацца за выкананьне і перавыкананьне заданьняў партыі і ўраду, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Мы маем ня мала гэткіх раёнаў, у якіх яўка выбаршчыкаў дасягае 70—85 проц. (Парычкі, Койданаўскі, Каралінскі, Талочынскі, Хойніцкі, Рэчыцкі і інш. раёны), прычым сярэдні процант яўкі па БССР раўняецца 66,8 (у мінулым годзе—58,82 проц.). На аснове перавыбараў сельскіх саветаў, пры дапамозе гэткага дзейснага мэтаду падвышэньня актыўнасьці выбаршчыкаў, як савецкая эстафэта, нам удалося ўзьняць высока хвалю новага прыліву ў калгасы і панесьці наперад сьцяг суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва як клясы.

Вось некалькі яскравых ілюстрацый правільнасьці гэтага нашага сьцьверджаньня: у Рафалаўскім сельсавеце, Магілёўскага раёну, арганізавана 7 новых калгасаў, у Каралінскім раёне перавыбары далі 10 новых калгасаў. Каротка гаворачы, на перавыбарах сельскіх саветаў мы ўцягнулі ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва, ў актыўную барацьбу за сацыялістычную перабудову вёскі, ў барацьбу за карэнную перабудову работы саветаў новыя шырокія масы сельскага пралетарыяту, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства. З гэтым буйнейшым актыўным палітычным баляцам мы ўступаем у новы этап выбарчай кампаніі: сёньня пачынаецца паласа раённых зьездаў саветаў.

У гэтым годзе значэньне раённых зьездаў саветаў асабліва вялікае ў сувязі з нашым агульным паваротам да раёну, як да асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы і ў прыватнасьці ў сувязі з ліквідацыяй акруг. У сваім дакладзе на XVI партыйным зьезьдзе тав. Сталін так вызначыў месца і ролю раёну: «Зараз цэнтр цяжкасьці калгаснага будаўніцтва перанесены ў раённыя арганізацыі. Сюды сьцякаюцца ніці калгаснага будаўніцтва і рознай іншай гаспадарчай работы на вёсцы, і па лініі калгасаў, і па лініі саветаў, і па лініі крэдыту, і па лініі загатовак». Раённыя зьезды саветаў бязумоўна будуць мець вялізарнейшае значэньне для далейшага ўзмацненьня раённага зьвяна, для падвышэньня ролі сельскіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў у справе правядзеньня генэральнай лініі партыі, у справе ажыцьцяўленьня вялізарных задач сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Якія-ж гэта задачы? Яны вызначаны ў тых кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР, якія былі нядаўна зацьверджаны апошняй сэсіяй ЦВК БССР і якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

Абхват валавой прадукцыі прамысловасьці ВСНГ рэспубліканскага значэньня павінен даць рост на 104,5%. Асабліва вялікі рост павінна даць прамысловасьць, якая вырабляе сродкі вытворчасьці (прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў—на 315,8, тарфяная—на 304, хэмічная на 144, мэталёапрацоўчая—на 125 проц.).

Зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі на 10 проц. павінна адбывацца разам з ростам прадукцыйнасьці працы на 30,3 проц., пры росьце намінальнай заработнай платы на 8,1% і павялічэньні колькасьці рабочай сілы на 55,1 проц.

Натуральна, што гэткія бурныя тэмпы разгортваньня рэспубліканскай прамысловасьці і вельмі высокія тэмпы росту ўсёй іншай прамысловасьці прад'яўляюць зусім выключныя патрабаваньні для далейшага разьвіцьця капітальнага будаўніцтва. У 1931 годзе ў строй дзейнічаючых прамысловых прадпрыемстваў увойдзе рад новых волатаў, будуць закладзены фундаманты і пачата будаўніцтва многіх новых заводаў, фабрык і электрастанцый.

Гэткі магутны працэс індустрыялізацыі БССР адкрывае зусім новыя пэрспэктывы для ўздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Трэці год пяцігодкі ставіць перад намі вялізарныя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі. Нам трэба дамагчыся калектывізацыі ня менш 35 проц. сялянскіх двароў БССР да канца 1931 г. Нам трэба пабудаваць і пусьціць у ход некалькі дзесяткаў новых МТС—гэтых фарпостаў сацыялістычнага наступу, гэтых важнейшых падважнікаў суцэльнай калектывізацыі. Увядзеньне у сельска-гаспадарчую вытворчасьць, у сацыялістычны сэктар яе некалькіх тысяч сталёвых конскіх сіл трактароў будзе азначаць, што мы пад сельскую гаспадарку БССР падводзім новую тэхнічную базу. 1931 год павінен быць пераломным годам у сэнсе ператварэньня БССР з раёну спажывецкага ў раён магутнага разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Гэткі схематычны і далёка ня поўны пералік асноўных нашых задач у горадзе і вёсцы. Але і гэтага пераліку зусім досыць, каб уявіць сабе навочна, што 1931 год для БССР, як і для ўсяго Савецкага Саюзу, будзе годам, у які мы зробім новыя буйнейшыя крокі па шляху індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі, перамагаючы шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў і іх агентаў ўнутры партыі—апартуністаў усіх масьцей.

У асьвятленьні гэтых задач зусім ясныя і зразумелыя тыя абавязкі, якія ўскладаюцца на раённыя зьезды саветаў і будучыя склады РВК.

«Мы маем ўсё,—гаварыў на 3-й сэсіі ЦВК СССР тав. Енукідзе,—для таго, каб перабудаваць саветы як у сэнсе палепшаньня іх масавай работы, так і ў сэнсе палепшаньня складу, арганізацыі ўнутранай структуры, узаемадносін і г. д., каб зрабіць іх вусім здольнымі праводзіць у жыцьцё ўсе гаспадарчыя і палітычныя задачы». Мы маем усё для таго, каб перабудаваць на справе сельсаветы і РВК тварам да саўгасаў, тварам да калгасаў, тварам да калектывізацыі. Трэба толькі хутчэй ажыцьцёвіць гэтую перабудову, асноўнай і неабходнай ўмовай якой зьяўляецца выгнаньне з сельсаветаў і РВК усіх чужых і клясава-варожых нам элемэнтаў, усіх апартуністаў, усіх бюракратаў і ўзьняцьце ролі саветаў у справе правядзеньня генэральнай лініі партыі.

Абапіраючыся на тую найвялікшую актыўнасьць усіх выбаршчыкаў, якую мы мелі ў часе перавыбараў сельсаветаў, абапіраючыся на той уздым, з якім гэтыя перавыбары прайшлі, раённыя зьезды саветаў і будучыя склады РВК, рашуча змагаючыся на два фронты і супроць прымірэнцтва, рашуча змагаючыся за ленінскую палітыку ў нацыянальным пытаньні і супроць ухілаў ад яе змогуць забясьпечыць ажыцьцяўленьне пляну трэцяга году пяцігодкі, змогуць забясьпечыць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, змогуць пад кіраўніцтвам партыі забясьпечыць завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

У Аршаншчыне недаацэньваюць палітычнага значэньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету

Першыя весткі аб ходзе перавыбараў Аршанскага Гарсавету сьведчаць аб нездавальняючым ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Лічбы гавораць аб тым, што аршанскія арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня перавыбараў саветаў наогул і асабліва Гарсавету.

Аршанскі раён, як былы акруговы цэнтр, у параўнаньні з сельскімі раёнамі мае цэлы шэраг умоў для лепшага правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, аднак гэтага на справе няма. Процант яўкі выбаршчыкаў на справаздачна-перавыбарчыя сходы Гарсавету нават ніжэй, чым процант яўкі на сходы па перавыбарах сельскіх саветаў Аршанскага раёну. (Дарэчы трэба адзначыць, што па правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі Саветаў Аршанскі раён стаіць на адным з апошніх мейсц у БССР).

На справаздачна-перавыбарчыя сходы Гарсавету ў сярэднім зьявілася 56 проц. выбаршчыкаў, што зьяўляецца зусім недапушчальным зьявішчам.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія Аршанскага Гарсавету не набыла характару масавай палітычнай кампаніі. Ні гарадзкая, ні раённая выбарчыя камісіі нават дакладна ня ведаюць як праходзіць гэта кампанія, напрыклад: на 1-га студзеня па 13 выбарчых вучастках праведзены перавыбары, але раённая і гарадзкая выбарчая камісіі маюць весткі аб выніках перавыбараў толькі з 4-х вучасткаў; нават на тэлеграфнае запатрабаваньне Цэнтральнай выбарчай камісіі, аб неадкладнай падачы вестак па астатніх вучастках, выбарчыя камісіі адказваюць маўчаньнем.

Сьнежанскі Пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) зазначыў, што «перавыбары павінны стаць важнейшым сродкам ка рэннае перабудовы на справе ўсёй работы саветаў». Гэта вымагае стварэньня такіх органаў дыктатуры пралетарыяту, якія на справе зьявяцца праваднікамі генэральнай лініі партыі ў сваёй практычнай рабоце, павядуць рашучую барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі партыі.

Гэтага, як відаць, аршанскія партыйныя, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі не разумеюць, ці ня хочуць разумець. Нічым іншым нельга тлумачыць таго, што ў Аршаншчыне вакол справаздачна-выбарчай кампаніі Саветаў не мабілізавана актыўнасьць выбаршчыкаў і ў першую чаргу рабочых мас гораду э тым, каб па бальшавіцку павярнуць саветы тварам да вытворчасьці, да саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, да выкананьня задач, якія паставіла перад імі партыя.

Усё гэта вымагае ад аршанскіх партыйных і савецкіх арганізацый неадкладна дабіцца карэннага пералому ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі Гарсавету, выправіць на хаду дапушчаныя памылкі і недахопы і дабіцца таго, каб справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў ператварылася-б у вялікую палітычна-масавую кампанію барацьбы за новыя саветы, якія здольны стаць сапраўднымі праваднікамі генэральнай лініі партыі, трэба рашуча ўдарыць па права-апартуністычнай недаацэнцы справаздачна выбарчай кампаніі Саветаў.

П. Я.

ПА-БАЯВОМУ УЗЯЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА ГОДУ

Апартуністыя Нова-Барысаўскай макароннай фабрыкі хаваюцца за „аб'ектыўныя прычыны“. Аршанскі бандарны завод ня выканаў прамфінплян ударнага кварталу

Б'ем трывогу

Усе тэрміны для пуску макароннай фабрыкі імя Леніна ўжо прайшлі. Па меркаваньнях трэба было нармальна пачаць працу з 1 студзеня 1931 г. Але грамадзкія арганізацыі, а таксама і партарганізацыі фабрыкі мала цікавілі ся пытаньнем чаму і па якой віне фабрыка ня пушчана ў тэрмін.

На працягу ўсяго сьнежня месяца ня было ніводнай тэхнічнай вытворчай нарады з удзелам усіх рабочых. Адміністрацыя ўвесь час абапіралася на «аб'ектыўныя прычыны», што быццам няма нямецкага мацнёра, не працуе «В. Э. О.» (Усесаюзнае Электра-Абсьпаньне), вэнтыляцыя дрэнна працуе, не хапае матар'ялаў і г. д.

Што-ж мы бачым сапраўды? А тое, што нямецкі мацнёр сваю працу скончыў да тэрміну; затрыманьне-ж ў спробе пэрсаў—толькі з боку нашай адміністрацыі. У выніку такога галавацяпства мы затрымліваем нямецкага мацнёра і плацім яму пмат грошай. Другое,—з боку «В. Э. О.» таксама няма затрыманьня.

У чым-жа справа! А вось у чым: на фабрыцы тэхпэрсонал (інжынэр і мэханік) за ўвесь час працавалі бяз усякіх рабочых чарцяжоў і плянаў, таму праца ішла няправільна, таму няправільным было скарыстаньне і разьмеркаваньне рабсілы; напрыклад, на працягу доўгага часу сталяры нацягвалі палатно на рамні, што маглі зрабіць і чорнарабочыя, у той час, калі сталяроў маглі скарыстаць на загатоўку шафы для спэцвопраткі, сталоў, і інш. работ, якія цяпер прыходзіцца рабіць. Бясплянавасьць даходзіла да таго, што рабочыя зьбіраліся і нават ня ведалі, што рабіць: ходзяць, шукаюць іншынэра, які на фабрыцы мала бывае. Сваячасова ня зроблена заяўка на матар'ялы, патрэбныя для пуску фабрыкі. Адміністрацыя і тэхнэрсанал чакалі да гэтага часу з электрычнымі лямпамі, сталамі, шклянкамі для скрынак з сырэвінай. Усё гэта ўзьдзейнічаньнем праз адпаведныя органы магчыма было атрымаць. Мы плацім цяпер 84 проц. налічэньне на заработак рабочым прамвэнтыляцыі ў той час, калі гэтую самую працу можна было правесьці сваёй рабсілай.

Бяда яшчэ ў тым, што няма кантролю, вучоту, што зроблена кожным рабочым за кожны дзень, чаму і паслабла працдысцыпліна на фабрыцы.

Належным арганізацыям трэба выявіць усе гэтыя ненармальныя зьявішчы, трэба ўзяцца рашуча за працу, каб як найхутчэй скончыць пабудову фабрыкі і запоўніць усе прабелы ў нашай працы.

Нова-Барысаў.

«Курс».

Плянава і эканомна скарыстаць рабсілу
Пастанова Наркампрацы БССР

У сувязі з тым, што на цэлым радзе прадпрыемстваў выявіліся значныя лішкі рабсілы, і для найбольш пляванага і эканомнага разьмеркаваньня і скарыстаньня рабсілы, Наркампрацы БССР, у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 15-XII 1930 г. («Изв. ЦИК СССР і ВЦИК» ад 17-XII 1930 г.) пастанаўляе:

1. Прапанаваць мясцовым органам працы сумесна з зацікаўленымі гаспадарчымі арганізацыямі зараз-жа прыняць меры да бездакладнай перакідкі лішняй рабсілы ў тыя галіны народнай гаспадаркі і транспарту, дзе адчуваецца востры недахват рабочых кадраў.

2. Мясцовым органам працы і дырэктарам прадпрыемстваў працягваць далейшую паглыбленую работу па выяўленьні лішнай рабсілы на тых прадпрыемствах, на якіх да гэтага часу гэта работа яшчэ не праароблена, і скараціць лішнюю колькасьць рабсілы для здавальненьня патрэб у рабсіле іншых прадпрыемстваў і транспарту.

3. У тых выпадках, калі на новых работах зарплата рабочых, якія перакідваюцца, у першы час будзе ніжэй іх ранейшай зарплаты, розьніца ў стаўках на працягу 2-х тыдняў павінна выплачвацца тым прадпрыемствам, з якога рабочыя былі перакінуты.

4. У выпадку адмаўленьня ад пераходу на новую работу пры захаванні п. 3 гэтай пастановы мясцовым органам працы і кіраўніцтвам кадрамі належыць на вучот гэтых рабочых ня браць, выхадная дапамога ў паказаных выпадках ня выплачваецца.

Наркампрацы БССР ГНІЛЯКЕВІЧ.

***

На цагельні № 4 Белбудаб'яднаньня ў Студзёнцы пабудавана пажарнае дэпо. Набыты інвэнтар знаходзіцца надта ў дрэнным становішчы. Насосы стаяць як папала і бяз колаў, якія ўзяты на другія патрэбы. Астатні інвэнтар таксама параскіданы. Пажарнай дружыны няма, дзяжурствы не адбываюцца.

Цікавы.

Ганебныя зьявішчы
Патрабуем прыцягнуць да адказнасьці сарваўшых сход

Цэлы тыдзень дзевяць калектываў саюзу «Саўгандальслужачых» рыхтаваліся да гэтага справаздачнага сходу. Па ўсіх гэтых калектывах былі праведзены агульныя сходы аб ролі і значэньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Дзяржгандальбел выклікаў на сацспаборніцтва на стопроцантную яўку Наркамгандль і Белсадгародніну. Наркамгандаль выклікаў Саюзхлеб, каб 13-га студзеня была стопроцантная яўка ўсіх рахбочых і служачых на справаздачы прадстаўніка Гарсавету.

Настрой сярод калектываў быў узьняты, у дзень 13-га студзеня к канцу заняткаў піянэры стройнымі калёнамі напомнілі аб справаздачным сходзе, былі арганізаваны лятучыя мітынгі. І 13 студзеня 600 асоб арганізаваным парадкам зьявіліся а 7 гадзіне ў клюб.

Верх узялі дзяржгандльбелаўцы, якія далі 100 - процантную яўку, іншыя калектывы далі 96—98 проц.

— Мы сёньня крытыкуем як сьлед, Гарсавет заслужыў, каб аб ім пагаварыць у парадку пралетарскай самакрытыкі, як сьлед,—чутны галасы ў залі.

Чакаюць дакладчыка...

—Хто дакладчык?

— Прадстаўнік ЦСПСБ тав. КАМЕНШТЭЙН, хутка прыдзе...

Але гэта «хутка» цягнецца звыш гадзіны, палова дзявятай ужо.

— Таварышы, супакойцеся,—заяўляе нехта з саюзу,—там Каменштэйн нечакана выехаў і нам абяцалі вылучыць тав. Казакевіча.

— Даёш Казакевіча, але пачынайце сход, ужо хутка 9 гадзін, мы ўжо чакаем амаль дзьве гадзіны.

— Праз хвіліначку,—лётаюць прафсаюзьнікі, вось, вось...

І «вось—вось» працягнулася да 10 гадзін ўвечары.

— Таварышы,—заяўляе (прадстаўнік саюзу)—ўпаўнаважаны ад гарсавету па перавыбарах, нам абяцаў даць Каменштэйна, Каменштэйн выехаў... у Гомель, Казакевіча мы не знайшлі, ён забыўся пра справаздачу.... А іншых няма таму, зачыняючы сход, абвяшчаю кіно...

Абурэньню сабраўшыхся няма канца, гэткі арганізаваны сход САРВАЎСЯ па віне галавацяпаў з гарсавету.

— Давесьці аб гэтым да ведама партыйных органаў і ўжыць захады супроць вінаватых,—прыняў пастанову ўвесь сход,—гэта ганебнае зьявішча.

Л. МАНІН.

ЯК НА ЗБОРЫ

— Аб чым будзе сход?—пытае адзін з выбаршчыкаў.

— Ды перавыбары Гарсавету і ма'быць бягучыя справы,—адказвае другі.

Яны нават ня ведаюць, чаго і навошта сабраліся!

Гэткая «падрыхтоўка» выразна адбілася на далейшым ходзе справаздачнага сходу. Звыш дзесятка чалавек цікутка крадучыся дэзэртыравалі са сходу, частка выбаршчыкаў літаральна спалі, пры чым частка нават з камфортам прымайстраваліся ва калёнаю на ложках (палова пакою мае прызначэньне Ленкутка, а другая—начная дзяжурка).

Яўка была дрэнная. На сход зьявілася толькі 68 проц. выбаршчыкаў (87—128). Гэта па рэгістрацыйным сьпісе, куды ўваходзяць і тыя, што ўцяклі са сходу да сканчэньня яго, і васнуўшыя.

Праўда, астатняя частка сходу сапраўды цікавілася вытворчымі пытаньнямі. Прамоўцы адзначалі недахопы ў рабоце гарсавету, якія перашкаджаюць пасьпяховай рабоце пажарных дружын: дрэннае забраканьне вуліц (па некаторых з іх нельга нават праехаць, асабліва ўвосень і весну), ад чаго машыны ломяцца, драўляныя масты на Сьвіслачы заўсёды дзіравыя, з машынаю ехаць небясьпечна, няма знакаў папярэджаньня пры раскопваньні вуліц міліцыёкія пасты не прыпыняюць на скрыжаваньнях вуліц руху, калі едзе пажарная дружына, няма правіл руху па вуліцах, як язды, так і хадзьбы. Гарсавет аб гэтым ня дбаў і ня цікавіўся.

Г. Ш.

Праваапартуністычная практыка ў рабоце Азарыцкага РВК
(Да дакладу Азарыцкага РВК на прэзыдыуме ЦВК БССР)

У раёне пры выкананьні плянавых заданьняў па хлебазагатоўках і бульбазагатоўках увесь націск зроблены на калгасны сэктар пры поўным паслабленьні ў выкананьні плянаў загатовак індывідуальнаму сэктару, асабліва, кулацкім і заможным гаспадаркам вёскі. У той час, калі ў раёне калгасамі занята 14 проц. усяе пасеўнае плошчы, а індывідуальны сэктар займае звыш 80 проц.,—Райвыканкомам процант выкананьня па хлебазагатоўках калгасам дадзены—32, а па бульбазагатоўках—39.

З прычыны такой апартуністычнай дырэктывы Райвыканкому, калгасы па выкананьні хлебазагатовак павінны былі здаць 11,5 проц. усяго свайго валавога збору ўраджаю, у той час, як на індывідуальны сэктар прыпадала толькі 4,5 проц. валавога збору ўраджаю. Па бульбазагатоўках калгасны сэктар павінны быў здаць 23 проц. валавога збору ўраджаю бульбы, а ў гэты час індывідуальны сэктар здаваў толькі 9 проц. валавога збору ўраджаю бульбы.

Згодна цьвёрдых дырэктыў ураду, у Азарыцкім раёне норма здачы па хлебазагатоўках у парадку кантрактыўных умоў, не павінна была перавышаць 4 проц. валавога збору збожжа. Аднак, гэта норма ў супярэчнасьць выразнай дырэктыве ўраду, даведзена да 6,2 проц. Кантрольная лічба ў 5,3 проц. да агульнага валавога збору ўсяго збожжа, у парадку загатовак таварных лішкаў ад калгаснага сэктару,—раённымі арганізацыямі зроблена абавязковай нормай для калгасаў. Кантрактацыя,—як заявіў старшыня РВК,—зьяўляецца справай дабраахвотнай і ніякага дачыненьня да загатовак ня мае, і здаецца, як кантрактацыя, а ня хлебазагатоўкі.

На 10 сьнежня 1930 г. калгасы раёну выканалі даныя ім пляны па хлебазагатоўках на 49 проц. і па бульбазагатоўках на 65 проц., што складае 5,7 проц. усяго валавога збору збожжа і 15,1 проц. усяго збору бульбы; індывідуальны-ж сэктар выканаў па хлебазагатоўках на 86,3 проц. і бульбазагатоўках на 92 проц.—валавы збор па хлебу складае ўсяго 3,9 проц. і па бульбе—8,6 проц.

Калгасная будаўніцтва ў раёне, ня будучы забясьпечаным належным кіраўніцтвам з боку раённых устаноў і арганізацый праводзіцца самацёкам. Па радзе калгасаў наглядаецца безгас падарчасьць, адсутнасьць працдысцыпліны, рвацкія настроі, разбазарваньне маёмасьці. Арганізацыйная работа ў значнай частцы калгасаў не наладжана. Разьмеркаваньне ўраджаю на 20-XII—1930 г. праведзена толькі ў 11 калгасах, а ў астатніх 13 калгасах да гэтага разьмеркаваньня ня прыступлена. Пытаньне жывёлагадоўлі ў раёне не вырашалася пытаньнем першачарговай важнасьці; у раёне наглядаецца драпежніцкае зьнішчэньне жывёлы, асабліва цягавай сілы.

Будаўніцтва сьвінарнікаў у спэцыялізаваных гаспадарках зусім сарвана. Крэдыты, вызначаныя на гэтую справу ў суме 34.000 руб., выкарыстаны не па простым прызначэньні. Укамплекта ваньне сьвінаматкамі на 20-XII—1930 г. у спэцыялізаваных гаспадарках выканана ўсяго на 45 проц. Плян укамплектаваньня малочных гаспадарак выканан толькі на 74 проц.

Работа з беднатой ў раёне не наладжана і беднота не арганізавана. Групы беднаты пры сельсаветах і камітэтах КСУ існуюць фармальна і ніякай работы не праводзяць. Пры большасьці калгасаў групы беднаты зусім не арганізаваны. За цэлы год у раёне было склікана толькі дзьве канфэрэнцыі груп беднаты. Карыстаючыся гэтым кулацкія элементы раёну залезьлі ў на асобныя сельскія саветы і калгасы, дзе праводзяць там сваю разбуральную палітыку. У калгасе «Беларускі гаспадар» на чале калгасу стаіць падкулачнік Драпеза Рыгор, які раней быў старшынёй сельскага савету і вычышчан адтуль за сувязь з кулацтвам. Будучы старшынёй калгасу Драпеза зьбіў калгасьніцу-батрачку. Там-жа ў калгасе на іншых адказных работах сядзяць заможнікі, сваякі старшыні. У калгас ня прымаюцца беднякі і батракі таму, што «нібыта ў калгасе няма жыльлёвых будынкаў». У калгасе «Прасьвет» з узятых вясной у каапэрацыі 36 плугоў зараз засталося толькі 2-3 плугі, астатнія невядома дзе дзе ліся. У гэтым-жа калгасе спалена на дровы значная колькасьць халодных будынкаў, у тым ліку спален хлеў былога нацыянальнага калгасу імя «Мясьнікова».

У свой час, калі раённыя ўстановы і арганізацыі захваралі вядомай «калгаснай хваробай—гігантаманіяй», яны аб'ядналі ў адзін калгас 4 калгасы, з якіх два існавалі з 1927 году, а адзін —нацыянальна-яўрэйскі з 1921 г. Паколькі, пасьля рэарганізацыі памянёных калгасаў у адзін калгас «Гігант», ня было забясьпечана кіраўніцтва, адсутнічала належная палітычна-выхаваўчая работа, гэты калгас пад уплывам кулацка-нэпманскай разбуральнай работы, развалуўся. На гэта сваячасова ня была вывернута належная ўвага, вакол гэтых фактаў ня была завострана грамадзкая думка.

Кампанія ўліку аб'ектаў абкладаньня на раёне праведзена надзвычайна кепска. Не кажучы ўжо аб тым, што на 20-XII—1930 г. спагнаньне сельгаспадатку выканана ўсяго толькі на 85,7 проц. і 51 проц. самаабкладаньня—шмат аб'ектаў абкладаньня захавана зусім. Ужо ў сьнежні месяцы ў вёсцы Асінаўка выяўлена захаваных 84 гектары пасеву і шмат жывёлы.

У раёне ёсьць шмат гаспадарак з яўнымі кулацкімі адзнакамі, аднак на ўсім раёне ў індывідуальным парадку абкладзена толькі адна гаспадарка. Раённыя ўстановы і сельсаветы, замест прыняцьця рашучых захадаў да выяўленьня маючыхся ў раёне кулацкіх гас падарак, апраўдваюць сваю бязьдзейнасьць права-апартуністычнай тэорыяй—у нас кулакоў няма.

Усё гэта трэба расцэньваць як праявы правага

1-шы ўсебеларускі зьлёт 25-тысячнікаў

13-га студзеня ў Доме Селяніна адкрыўся першы Ўсебеларускі зьлёт рабочых 25-тысячнікаў. На зьлёт прыбыло звыш 200 дэлегатаў.

Прэзыдыум зьлёту абраны у складзе 25 асоб. У Прэзыдыум уваходзяць т. т. Шаранговіч, Гантман, Груновіч (ЦК КП(б)Б), старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў, старшыня ЦКК тав. Калнін, Нарком Земляробства БССР тав. Рачыцкі, прадстаўнікі Калгасцэнтру і Саўгассавету СССР т. т. Краснамовец і Дорынаў, прадстаўнікі ЦСПСБ і рабочыя 25-тысячнікі.

Паводле прапановы тав. Семянкова зьлёт абірае ганаровы прэзыдыум у складзе Палітбюро ЦК УсеКП(б), а так сама т. т. Андрэева, Гея і Галадзеда.

Ад імя ЦВК БССР выступіў з прывітаньнем тав. Чарвякоў. З прывітаньнем ад Калгасцэнтру Саюзу ССР выступіў тав. Краснамовец.

На вячэрнім пасяджэньні 13-га студзеня зьлёт заслухаў даклад заг. аддзелу агітацыі і масавых кампаній ЦК КП(б) тав. Гаруновіч аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК. Зьлёт паслаў прывітальныя тэлеграмы Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б.

Ход калектывізацыі і падрыхтоўка да веснавой сяўбы

На ранішнім пасяджэньні 14 студзеня з вялікім дакладам аб ходзе калектывізацыі, падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і задачах 25-тысячнікаў выступіў Нарком Земляробства БССР тав. Рачыцкі.

У сваім дакладзе тав. Рачыцкі спыніўся на тых задачах, якія стаяць зараз перад намі ў галіне падрыхтоўкі да 2-й бальшавіцкай вясны.

На працягу 1931 году—гаворыць таварыш Рачыцкі—павінна быць уцягнута ў калектыўныя гаспадаркі 45 проц. усіх бяднацка-серадняцкіх гаспадарак БССР. Да надыходзячай веснавой сяўбы трэба калектывізаваць ня менш 30 проц. гаспадарак. Побач з па дачай шпаркіх тэмпаў калектывізацыі перад намі стаіць задача сканцэнтраваньні калектыўных гаспадарак, перабудаваньне іх па прынцыпу прамысловасьці. Ад тэмпаў узмацненьня калектывізацыі і ад выкананьня ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній залежыць наша здольнасьць забясьпечыць прамысловасьць патрэбнай сыравінай, а рабочых—прадуктамі харчаваньня.

Мы ставім перад сабою сёлета задачу пашырэньня пасеўных плошчы ў параўнаньні з мінулым годам на 14—15 процантаў. З другога боку павінна зьмяніцца структура пасеўных плошчаў ў залежнасьці ад праблемы разьвіцьця жывёлагадоўлі. Так, засеўная плошча збожжавых культур скарачаецца за кошт пашырэньня засеву тэхнічных і кармовых культур: азімна зьмяншаецца ад 37—33 проц., наадварот, тэхнічных культур запраектавана сёлета 280.000 га супроць 150—160.000 га летась. Кармовых траў запраектавана ў гэтым годзе 500.000 га супроць 200.000 га ў мінулым годзе.

Выходзячы з гэтых вялікіх задач, па падрыхтоўцы веснавой сяўбы патрэбна максымальная мабілізацыя ўсіх сродкаў вытворчасьці і арганізацыйнай здольнасьці па апрацоўцы і ўборцы будучага ўраджаю. Мы павінны выкарыстаць усе незанятыя землі пад пасевы, якія да гэтага часу ня былі ўцягнуты ў севазварот. Трэба заража належна разгарнуць справу стваральненя пасенных фондаў і рамонту сельска-гаспадарчых машын і трактарнага парку. Разам з тым трэба не забываць аб забесьпячэньні веснавой сяўбы неабходнай сілай.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў надыходзячай веснавой сяўбы зьяўляецца вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі. Для поўнага забесьпячэньня рабочых цэнтраў мяснымі і малочнымі прадуктамі намечана арганізацыя цэлага раду буйных жывёлаводчых гаспадарак. У мінулым годзе было арганізавана 70 савецкіх сьвінагадоўчых гаспадарак і 370 калгасных. Па буйнай рагатай жывёле маем 330 малочных калгасных гаспадарак. Разьвіцьцё буйных жывёлагадоўчых гаспадарак вымагае адпаведнага вырашэньня кармовай праблемы. Трэба пашырыць пасевы траў, кораніплодаў, сілосных культур, палепшыць якасьць сенажацяй.

Узрастаючы сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі патрабуе адпаведна падрыхтаваных кадраў. Няма чаго чакаць, пакуль навучальныя ўстановы дадуць нам гэтыя кадры. Не адкладаючы ніводнай хвіліны мы павінны самі прыступіць да падрыхтоўкі гэтых кадраў з гушчаў саміх калгасьнікаў-актывістаў. З другога боку, трэба зьвярнуць увагу на ўцягненьне жанчын у кіруючую калгасную работу. Да гэтага часу ў цэлым шэраг галін працы калгасаў не ўцягнуты жанчыны: жывёлагадоўля, садаводная, ільнярская справа і г. д.

У заключэньне дакладчык адзначыў, што пры няўхільным выкананьні рашэньняў партыі, накіраваных на індустрыялізацыю краіны, на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, на ліквідацыю кулацтва як клясы—пры шырокім практыкаваньні мэтадаў ударніцтва, сустрэчных плянаў, у сельскай гаспадарцы будзе цалкам выканана праграма сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

***

У спрэчках па дакладу т. Рачыцкага запісалася 40 чалавек.

Старшыня камуны «Індустрыя» т. Кенсман зазначыў, што вэтэрынарная дапамога на мясцох недастаковая, не хапае мэдыкамэнтаў, сьвіньні ад гэтага гінуць. Трактарныя станцыі не даюць належнага эфэкту, бо пры іх няма запасных частак

Тав. Грышаеў (калгас імя Энгельса, Уваравіцкага р-ну) кажа, што ў гаспадарцы ня хопіць кармоў. Ужо прыходзіцца перайсьці на жорсткую норму і даваць карове па 3 кілё грубых кармоў у дзень. Прыходзіцца скарыстоўваць на сечку салому дрэннай якасьці. Але на гэтым нельга будзе пратрымаць жывёлы да вясны, патрэбны канцэнтраваныя кармы.

У нас няма цьвёрда вызначанай праграмы,—кажа тав. Крылоў. (Касьцюковіцкі раён)—пры арганізацыі сьвінаводных гаспадарак. Адразу праводзіцца будаўніцтва сьвінарнікаў і камплектаваньне сьвінаматкамі. Сьвінарнікі яшчэ не гатовы, а сьвіньням прыходзіцца стаяць у халодных і непрыстасаваных памяшканьнях, у выніку чаго сьвіньні часта хварэюць.

Тав. Крылоў зварочвае ўвагу на тое, што трактарны парк часта не выкарыстоўваецца ў нас належна. Часта прастой трактароў дасягаюць 50 процантаў з прычыны адсутнасьці патрэбных запасных частак. Асабліва дрэнна пастаўлена справа з завозам запасных частак да трактароў маркі «Манарх».

Тав. Левін (Пухавіцкі р.) падкрэсьлівае той факт, што многія калгасы да гэтага часу ня скончылі разьмеркаваньня ўраджаю. Калгасьнік ня ведае, што ён атрымае. Гэта адмоўна адбіваецца на працэсе далейшай калектывізацыі. Райкалгассаюз ня рупіцца аб тым, каб хутчэй закончыць разьмеркаваньне ўраджаю.

З боку Райкалгассаюзу таксама ня былі ўжыты своечасова меры каб спачатку зімовага пэрыяду перавесьці жывёлу на жорсткі рэжым кармленьня. З гэтае прычыны ў многіх калгасах кармы выдаткоўваліся нерацыянальна і неэканомна.

„Савецкая Беларусь" дапамагла

Стара-Дароская РайРСІ на допіс селькора «Ведаючы»—«Пра настаўніка-заможніка»—паведамляе, што адзначаныя ў допісе факты пацьвердзіліся. Справа настаўніка Т. Урдановіча перададзена мясцкому, Райнопэктару Нарасьветы для зьняцьця з працы і выключэньня з членаў саюзу.

На допіс селькора «Савецкай Беларусі» «Вылазка контрэвалюцыі», які быў накіраваны на расьледваньне, Мсьціслаўская Райміліцыя паведамляе, что Трайкін выключаны з ліку студэнтаў Горацкай с.-г. акадэміі.

На допіс пад загалоўкам «Абвяржэньне» Чэрыкаўскі РВК паведамляе, што адзначаныя факты ў допісе пацьвердзіліся. Справа аб непрыняцьці бульбы каапэрацыяй перададзена пракурору.

Юраўвіцкая РайРСІ паведамляе, што допіс «Аб забясьпечаньні настаўніцтва» пацьвердзіўся цалкам. Прыказчык Хобінскай спажывецкай каапэрацыі зьняты з працы, члену праўленьня Ўрэцкаму дадзена вымова.

На допіс селькора «Пайнік»—Злачынства ў спажывецкім таварыстве, Коханаўская РСІ паведамляе, што факты ў допісе пацьвердзіліся цалкам. Справа Капалевіча накіравана для разгляду у нарсуд.

Лельчыцкая Райна на допіс селькора «Пчала»—«Другі год як няма працы» паведамляе, што факты азначаныя ў заметцы адпавядаюць сапраўднасьці. Загадчык хаты-чытальні Чэчка зьняты з працы, новаму загадчыку дадзены адпаведныя паказаньні.

Заслаўскі Райкалгассаюз на допіс «Аб калгасбудаўніцтве» паведамляе, што вялося сьледзтва. Азначаныя ў допісе факты пацьвердзіліся, абвінавачаныя прыцягнуты да судовай адказнасьці, а таксама пастаноўлена перабрать склад праўленьня «Чырвонай Зоркі».

На допіс селькора «Савецкай Беларусі» Л. Л. «Здайце жалезны лом»,—Уваравіцкі Райкалгассаюз паведамляе, што адзначаныя ў допісе факты мелі месца. Калгасу «Калініна № 2» тэрмінова дадзена распараджэньне аб здачы лому Рудмэтальгандлю.

На допіс селькора «Калгасьніка»—«Галаваціпы зрываюць уборачную кампанію» — Чэрвенскі Райкалгассаюз паведамляе, што вялося сьледзтва, адзначаныя ў допісе факты пацьвердзіліся. Старшыні праўленьня калгасу «Кастрычнік» за нядбайныя адносіны вынесена вымова.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

⊙ **НА 7-МІГАДЗІННЫ ДЗЕНЬ ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПЕРАВЕДЗЕНЫ МЕНСКІ ХЛЕБАЗАВОД.**

⊙ **УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ІНЖЫНЭРАЎ І ТЭХНІКАЎ.** 10-га лютага ў ў Менску адбудзецца Ўсебеларускі зьезд інжынэраў і тэхнікаў. Зьезд працягнецца 3 дні. На зьезд запрошаны 35 дэлегатаў. Асноўным пытаньнем зьезду зьяўляецца—выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці.

⊙ **500.000 РУБЛЁЎ** у 1931 годзе асыгнавана на арганізацыю ў саўгасах БССР дзіцячых ясьляў. Па лініі ЦП саюзу сельгаслесрабочых на гэта мерапрыемства адпушчана 70.000 руб.

⊙ **УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ФЗВ.** 22-га студзеня ў Менску пачнецца Ўсебеларуская канфэрэнцыя школ фабзавучаў мэталістаў.

Асноўнае пытаньне канфэрэнцыі—падрыхтоўка кадраў.

⊙ **ШТУРМ ПРАРЫВАЎ НА ФРОНЦЕ ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ.** ЦП мэталістаў уключылася ў штурм прарываў у ліквідацыі няпісьменнасьці.

Ва ўдарным парадку арганізуюцца брыгады, якія паедуць у раёны на дапамогу ліквідацыі няпісьменнасьці на мясцох.

14-га студзеня ў Менску адбудзецца нарада аб ліквідацыі прарываў на фронце няпісьменнасьці.

⊙ **ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ЗРЫВАЕЦЦА.** Прэзыдыум ЦП саюзу мэталістаў заслухаў на сваім апошнім паседжаньні даклад аб тым, як праходзіць перавыбарчая кампанія на прадпрыемствах мэталістаў.

Прэзыдыум адзначыў, што ня гледзячы на рад дырэктыў, няма 100-процантнай яўкі выбаршчыкаў.

Апроч гэтага, часта здараецца так, што справаздачныя сходы зрываюцца таму, што дакладчыкі не зьяўляюцца на сход, або спазьняюцца на некалькі гадзін (Эльвод, імя Ланцуцкага).

Прэзыдыум саюзу мэталістаў прапанаваў усім фабзаўмясцкомам ужыць рашучыя меры да таго, каб ня зрываць справаздачныя сходы гарсавету.

⊙ **ПАДРЫХТОЎКА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН.** Па ўсіх прадпрыемствах гор. Менску ідзе хуткая падрыхтоўка да Ленінскіх дзён.

7-ая гадавіна са дня сьмерці Леніна павінна быць праведзена, як масавая кампанія пад лёзунгам выкананьня заданьняў трэцяга году пяцігодкі, мабілізацыі мас па разгортваньні сацпаборніцтва і ўдарніцтва і пад лёзунгам выкананьня задач і пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і кастрычнікіўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

У сучасны момант па ўсіх фабзаўмясцкомах складаюцца пляны правядзеньня гэтых дзён. Па цэхах і прадпрыемствах арганізуюцца ўдарныя і скразныя брыгады імя Леніна і трэцяга году пяцігодкі.

У Ленінскія дні па ўсіх Менскіх прадпрыемствах, клюбах і чырвоных кутках будуць праведзены лекцыі на наступныя тэмы: «Ленін і калектывізацыя», «Ленін і Камінтэрн», «Ленін у барацьбе з рознага роду ўхіламі».

З 19-га па 23-е студзеня ў рабочых клюбах будуць арганізаваны жалобныя дні.

У падшэфныя раёны Менскіх заводаў і фабрык будуць камандыраваны рабочыя брыгады.

ПЕРАПІС НЯПІСЬМЕННЫХ

ЦСПСБ разаслаў тэрміновы ліст усім райпрафсаветам аб тым, што перапіс няпісьменных, які павінен быў скончаны 15-га сьнежня, да гэтага часу яшчэ ня скончаны.

Такое становішча зьяўляецца ганебным зрывам усесаюзнага перапісу і сьведчыць аб палітычнай недаацэнцы прафсаюзамі важнейшай палітычнай работы.

ЦСПСБ катэгарычна прапанаваў пад адказнасьць старшыні райпрафсаветаў у хуткі тэрмін скончыць перапіс і выявіць прычыны перашкаджаючыя гэтай рабоце. Вінаваты ў гэтым будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

⊙ **ПРАВАЛ ФІНІШУ.** Апошнія інфармацыі на паседжаньні Полацкага раённага штабу па культэстафэце апэрацыйных троек такіх важных прадпрыемстваў, як Полацкі чыгуначны вузёл, саюз мэталістаў, саюз будаўнікоў, прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва, пэдагагічны тэхнікум і інш. гавораць аб тым, што на Полаччыне культэстафэта канчаткова правальваецца. Апэрацыйныя тройкі большасьці ўстаноў ня толькі не мабілізавалі вакол задачы культэстафэты савецкай грамадзкасьці, але і самі ганебна бязьдзейнічаюць.

Брыгады культармейцаў ня ўсюды арганізаваны, а там, дзе арганізаваны, не скарыстоўваюцца адпаведным чынам. З 93-х слухачоў прафтэхшколы агнятрывалага будаўніцтва толькі адзін займаецца на ліквункце, у той час, калі ў горадзе дзякуючы недахопу ліквідатараў, шмат няпісьменных не ахоплена ліквунктамі.

Чыгуначны вузел зусім праспаў культэстафэту. Ліквункты хоць і арганізаваны, але ня ўсе працуюць, таму вельмі часта развальваюцца. Ідэя палітэхнізацыі ажыцьцяўляецца з надзвычайнай марудназьцю. Партыйны калектыў чыгункі выпусьціў з пад увагі справу культурнага будаўніцтва і ня кіруе ходам культэстафэты.

Саюз мэталістаў з палітэхнізацыяй ніяк ня можа справіцца: то наведваньне не вучняў адбіваецца на выкананьні прамфінпляну, то рабочыя не займаюцца з вучнямі.

Зусім не адчуваецца работы студэнтаў пэдтэхнікуму і лесатэхнікуму. Фактычна-ж Полацкія студэнты пягнуцца ў хвасьце агульнай работы па выкананьні пяцігодкі культурнага будаўніцтва.

Што-ж да камсамольскай арганізацыі, дык яна, пачаўшы з трэскам культэстафэту па раёне, піханька спыніла гэтую справу... Райком камсамолу абмежаваўся тым, што на паседжаньні заслухаў інфармацыі некалькіх ячэек аб ходзе культэстафэты. Вылучаныя асобнымі ячэйкамі ліквідатары няпісьменнасьці не скарыстаны і па сёньнешні дзень.

У вёсцы з культэстафэтай справа яшчэ горш. Работа ліквункта заняпадае, не разгарнуўшыся. У Арлейскім сельсавеце дагэтуль нават ня складзены апэрацыйныя тройкі. Няма чаго гаварыць пра разгортваньне культурнай работы вакол хат-чытален і чырвоных куткоў, бо тут абсалютна ні чога ня зроблена.

Раённы штаб ня прыняў і ня прымае адпаведных крокаў для ліквідацыі гэтых прарываў.

Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б

Аб набору ў Камуністычны Інстытут Журналістыкі

Задачы далейшага палепшаньня друку і павышэньня яго ролі ў разгортваньні сацыялістычнага наступленьня патрабуюць ад рэдактароў і ўсяго складу рэдакцыйных працаўнікоў сапраўдна бальшавіцкай вытрыманасьці і арганізатарскіх здольнасьцяй уменьня па баявому і неабходнымі тэмпамі арганізаваць масы на вырашэньне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 11-XI—30 г.).

Пастанова ЦК Усе КП(б) ад 11-XI—30 г. адзначаючы—нездавальняючы падбор, а таксама склад, падрыхтоўку і перападрыхтоўку рэдакцыйных працаўнікоў..., лічыць у сучасны момант рашуча неабходным, каб партарганізацыі ўдзялілі асаблівую ўвагу кадрам газэтных работнікаў.

Сярэдняе зьвяно цэнтральных, рэспубліканскіх, краявых, абластных, а таксама рэкадтароў буйных раённых і гарадзкіх газэт рыхтуе КІЖ (з пост. ЦК).

Згодна гэтай-жа пастановы ЦК УсеКП(б) к канцу пяцігодкі ва ўсіх раёнах будуць створаны самастойныя друкаваныя газэты.

Усё гэта патрабуе ад нас надзвычайнай ўвагі да справы падрыхтоўкі кадраў газэтных работнікаў, да справы камплектаваньня лепшымі працаўнікамі рэдакцыі газэт. Гаркомы і Райкомы КП(б)Б, разам з рэдакцыямі ваенных гарадзкіх і раённых газэт павінны адабраць і накіраваць лепшых рабселькораў-ударнікаў (членаў КП(б)Б) на вучобу ў 1931-32 г. у Камуністычны Інстытут Журналістыкі. Гаркомы і Райкомы КП(б)Б павінны забясьпечыць поўнае выкананьне наступнай арыентоўчай разьвёрсткі месц у КІЖ у гэтым годзе: Менскі—Гарком КП(б)Б—5 чал., Віцебскі—4, Гомельскі—4, Аршанскі—3, Полацкі—2, Магілёўскі—2, Рэчыцкі—2, Барысаўскі—2, Жлобінскі—2, Клімавіцкі—2, Мазырскі—1, Слуцкі—1, Бабруйскі—2.

Правілы прыёму

Для рабочых з вытворчасьцю, мазочых значны вытворчы стаж дапусьцімa зьніжэньне партстажу да 3 г., пры ўмове адпаведнасьці ўсім іншым запатрабаваньням.

Адбор кандыдатаў і дасылку ўсіх дакумэнтаў у Культпроп ЦК КП(б)Б неабходна правесьці тэрмінова—не пазьней 25-га студзеня с. г.

Райкомы КП(б)Б, якія не пералічаны ў разьвёрстцы таксама могуць рэкамэндаваць кандыдатуры.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б Чарнушэвіч.

Пам. Загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б па друку Курцік.

Апавяшчэньні

18-га СТУДЗЕНЯ НАРАДА РАБОТНІКАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РАЁННЫХ ГАЗЭТ.

У нядзелю 18-га студзеня 1931 году роўна а 6-й гадзіне ўвечары (з пацямкамі нарады і 19-га студзеня) у пацямкаваньні малай залі ЦК КП(б)Б Сэкцтар Друку Культпропу ЦК КП(б)Б склікае пашыраную нараду камуністых—работнікаў цэнтральных газэт і рэдактароў усіх раённых газэт БССР, разам з партчастакаю калегіі Наркамзему, Калгасцэнтру, Садсаюзу, Малочнага Саюзу і Паляводсаюзу.

На абвестцы дня: 1. Уступнае слова Сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча.

2. Даклады т.т. Міцькова і Курціка —«Колектывізацыя, пасеўная кампанія і «друк».

3. Даклады рэдакцый газэт: «Беларуская Вёска», (дакладчык т. Шмідт, садакладчык ад Сэктара Друку т. Вітлін), «Маяк Камуны» (дакладчык тав. Фалкін, садакладчык ад Сэктара Друку т. Бер) і «Палеская Праўда» (дакладчык т. Давідовіч, (садакладчык ад Сэктара Друку т. Красіна)—аб пастановуцы ў гэтых газэтах пытаньняў колектывізацыі, пасеўнай кампаніі і аб падрыхтоўцы да ўсесаюзнай нарады па пытаньням рабселькораўскага руху.

4. Даклад аб спэцыялізацыі раённых газэт у адпаведнасьці з эканамічнымі асаблівасьцямі раёнаў.

5. Аб газэце «Рабселькор» і

6. Бягучыя справы.

Рэдактары раённых газэт павінны прывезьці з сабою па тры поўных камплекты раённых газэт (з дню іх выхаду), а таксама ў двух экэмплярах падрабязную пісьмовую справаздачу аб ходзе падрыхтоўкі ў раёне да ўсебеларускай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Прыяжджаючым на нараду таварышом трэба зьявіцца да тав. Мусінай (Культпроп ЦК КП(б)Б, пакой № 16).

Сваячасовая яўка ўсіх выклікаемых на нараду абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

«Парткалегія ЦККК КП(б)Б уносіць наступныя зьмены па выкліках апэлюючых на ПТ ЦККК УсеКП(б).

Акрамя выкліканых раней т. т. на 16, 17, 18, 19, 20 студзеня з 10 гадз. раніцы выклікаюцца наступныя т. т. у зьмену раней абвешчаных ім тэрмінаў:

На 16-I—1931 г. Кулеш Г., Масевіч В. А., Давыдаў П. Р., Сабіла С. М., Цяўлоўскі К. І., Эпштэйн М. Н., Белы А., Фейгельман Я. Л., Кантаровіч С. З., Панасевіч Ул. Л., Гарэлік Б. М., Сурэмкін Н. М., Гурскі А. Я., Татарыцкі П. А., Гітлін З. Х.

На 17-I—31 г. Эльянаў С. О., Лапіцкі С. Н., Сідарэнка П. І., Федарэнчык Я. С., Сташэўскі К. Н., Цузакевіч Ул. І., Шыраеў А. Н., Магідаў А. С., Гранчык Р. А., Давідовіч Д. Я., Худавец П. А., Радкевіч І. С., Вараб'ёў Т. Я. Маркін Б. С., Русіновіч П. У.

На 18-I—31 г. Буракоў М. У., Сьнежкоў А. А., Цыклін Л. А. Навіцкі А. П., Федасеяў І. А., Шэйман І. Ш., Герашчанка І. М., Шэйман І. У., Дворкін Я. М., Робак А. А., Галкін Е. Ф., Сьпевак М. А., Малева М. М., Костко Н. У., Бараша П. С.

На 19-I—31 г. Дубнель Д. А., Корба С. Р., Герасімаў М. М., Раўнейка П. С., Бабіч Ф. Дз., Астапенка Н. А., Гурко Ул. Е., Белаусаў Д. І., Ананевіч Р. К., Гольдзін М. Я., Бараноўскі Ул. А., Суворaў М. М., Рэпкавец С. В., Грычэнко Я. Ц.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	15 студзеня 1931 г. **паказ для Белдзяржбуду** „ПЕРШАЯ КОННАЯ" Прызначаная Чырвонай армі. Па атак у 9 гадзін.
Кіно-тэатр „Культура"	Ад панядзелка 12 студзеня Лепшы фільм з эпохі грамадзянскай вайны „Табе дару" Драма ў 6 разьдзелах. Звыш праграмы хроніка саюзкіно № 64. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Ад панядзелка 12 студзеня Шкавы фільм па апавяданьню Шолом-Алейхема **Яўрэйскае шчасьце** Звыш праграмы часопіс Саюзкіно № 6. Пачатак а 6 г. Каса а 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	Ад панядзелка 12 студзеня амэрыканскі фільм **Чорны цыклён** Пачатак а 6 гадзіне. Каса ад 4 з паловай гадз.
Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"	Ад панядзелка 12 студзеня 1. „ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ" драму ў 6 частках. 2. „Глядзі ў корань" кіно-фэльетон. 3. Чэмпіёны плаваньня Замежны гукавы фільм. Пачатак а 7 гадз. Каса а 5 гадз.
Дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"	Ад панядзелка 12 студзеня апошняя с рыя **„Чырвоныя дзьяваляты"** Пачатак а 1-й гадзіне Каса а 12.

Усебеларускае Акцыйнае Т-ва

„Белсельхозснаб"

даводзіць да ведама ўсіх акцыянэраў т-ва, што 25-га студзеня 31 году ў памяшканьні праўленьня (Менск Савецкая 47) а 7 гадз. увечары адбудзецца

чарговы агульны сход акцыянэраў Т-ва

з наступнай абвесткай дню:

1. Справаздача аб дзейнасьці праўленьня.
2. Справаздача рэвізыйнай камісіі.
3. Плян работы праўленьня на 1931 г.
4. Зацьверджаньне каштарысу выдаткаў на 1931 г.
5. Бягучыя справы.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ГАРАДЗКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА

ўсіх фабкомаў, заўкомаў, групкомаў, мясцкомаў і іншых прафсаюзных арганізацый, а таксама вайсковых частак гарнізону і самагужна-прамысловых арцеляў у г. Менску, што, пачынаючы з 20 студзеня па 10 лютага г. г. разам з перавыбарамі дэпутатаў Менгарсавету, будуць праводзіцца

і перавыбары народных засядацеляў у суды гор. Менску

Гарадзкой Выбарчай Камісіяй разасланы і рассылаюцца па ўсіх выбарчых участках паведамленьні і аб колькасьці Нар. засядацеляў, падлягаючых абраньню па кожным выбарчым участку, д я падрыхтоўкі кандыдатур і папярэдняга абгаварэньня іх грамад касьцю.

За ўсімі спраўкамі і тлумачэньнямі па даным пытаньні належыць зварочвацца ў Гарсавет (пакой № 5, або па тэлефону № 6-49, дзе будзе знаходзіцца дзяжурны прадстаўнік Вярхоўнага суду і Гарадзкой Выбарчай Камісіі

Пам. Старшыні Гар Выбарчай Камісіі Часынкоўс і.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыяту Працы БССР

пра перакідваньне рабочай сілы

У сувязі з тым, што на цэлым шэрагу прадпрыемстваў выявіліся значныя лішкі рабсілы і для найбольш плянавага і эканамічнага разьмеркаваньня і скарыстаньня рабсілы НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ПРАЦЫ БССР, у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР за 15-XII—1930 г. (Изв. ЦИК СССР И ВЦИК от 17-XII—30 г.) ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць мясцовым органам працы сумесна з зацікаўленымі гаспадарчымі організацыямі зараз-жа прыняць меры да безадкладнай перакідкі лішней рабсілы ў тыя галіны народнай гаспадаркі і транспарту, дзе адчуваецца востры недахоп у рабочых кадрах.

2. Мясцовым органам працы і дырэктарам прадпрыемстваў працягваць далейшую паглыбленую работу па выяўленьні лішкаў рабсілы на тых прадпрыемствах, на якіх да гэтага часу гэткая работа яшчэ не праведзена і скараціць лішнюю колькасьць рабсілы для задавальненьня патрэб у рабсіле іншых прадпрыемстваў і транспарту.

3. Утых выпадках, калі на новых работах зарплата рабочых, якія перакідваюцца ў першы час будзе ніжэй іх ранейшай зарплаты, розьніца ў стаўках на працяку 2-х тыдняў павінна выплачвацца тым прадпрыемствам, з якога рабочыя былі перакінуты.

4. У выпадках адмаўленьня ад пераходу на новую работу пры захаваньні п. 3 гэтай пастановы мясцовым органам працы належыць на вучот кіраўніцтваў кадраў гэтых рабочых не браць, выхадная дапамога ў паказаных выпадках не выплачваецца.

Наркамправ працы Гнілякевіч.

ПАПРАЎКІ

У газэце „Савецкая Беларусь" за № 7 (3096) ад 9-I—31 г. зьмешчана пастанова НК Працы БССР, інструкцыя і формы складаньня плану патрэбнасьці і забясьпечаньня рабсілай на 1931 г., у якіх надрукаваны наступныя памылкі:

Дадатак № 1	НАДРУКАВАНА:	ПАВІННА БЫЦЬ:
гр. 36-37	Сем'і рабочых	Сем'і рабочых і служ.
„ 38-39	Інш. несельскае	Батракі
„ 40-41	Калгасьнікі	Беднякі, калгасьнікі
„ 42-43	Некалгасьнікі	Сяляне, маючыя праз на рэгістрацыю
Дадатак № 3		
гр. 12	Батракі і калгасьнікі	Батракі
„ 13	Сябры прафсаюзаў і іх сем'і.	Сем'і рабочых і служ. і іншых, якія ня маюць працы

Ст. Інспэктар НКПБ КОНЬНІКАЎ.

Дадатак да пастановы Наркамправ працы БССР ад 7 студзеня 1931 г. за № 2, надрукаванай у № 11 газ. „Сав. Беларусь" ад 13 студзеня 1931 года.

ВЕСТКІ

аб перакідваньні былых акруговых работнікаў у раёны

Па _____ раёну

	Усяго вылучана	З I X: Перакінута ва ўставы раённага значэньня	Аслабавено ад перакід.	Адмовілася ад перакід.	Не перакінута за адсутн. патрэбы
1. Якія знаходзяцца на вучоце ў кіраўн. кадраў.					
2. Працуюч. ва ўстановах і прадпр. раённага знач.					
Усяго					

Калі прыпаўнікоў для ўстаноў раённага значэньня не хапае, дык паказаць колькі асоб.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыяту Працы БССР

пра парадак падрыхтоўкі шофэраў на 1931 г.

13 студзеня 1931 г. № 3 г. Менск

У мэтах найбольш плянавай падрыхтоўкі і плянавага разьмеркаваньня кваліфікаваных кадраў аўта-транспартных рабочых і прыстасаваньня тэрмінаў падрыхтоўкі шафераў да тэрмінаў завозу аўтамашын, Народны Камісарыят Працы БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Падрыхтоўка шафераў арганізуецца НКПБ паводле плянавых заявак аўта-транспартных і іншых гаспадарчых арганізацый аб патрэбнасьці ў кваліфікаваных аўта-рабочых (шафераў-вадзіцеляў і рамонцёраў).

2. Тэрмін падачы паказаных заявак у НКПБ устанаўліваецца не пазьней 23 студзеня 1931 г. У заяўках паказаць: а) патрэбнасьць у шаферах на 1931 г., б) крыніцы пакрыцьця гэтай патрэбнасьці, в) тэрміны і месцы патрэбнасьці, г) дасканальная кваліфікацыя (вадзіцель, рэманцёр).

3. Арганізацыі не падаўшыя заявак аб патрэбнасьці шафераў у вызначаны тэрмін ня ўключаюцца Наркамправ працы БССР у плян сваёй падрыхтоўкі шафераў-вадзіцеляў і рамонцёраў.

4. Практычнае выкананьне падрыхтоўкі шафераў вытвараецца на падставе дагавораў заключаных паміж Наркамправ працы БССР і арганізацыямі падаўшымі заяўкі аб патрэбнасьці шафераў. Тэрмін заключэньня дагавораў устанаўліваецца да 5 лютага 1931 г.

5. Па окончэньні шаферамі курсаў ЦПТа, яны пасылаюцца на практычную работу па сваім арганізацыям на 1-2 месяцы (ў залежнасьці ад паяўнасьці і прыбыцьця аўта-машын) з захаваньнем за імі ў працяку гэтага тэрміну стыпэндыі за кошт гэтых аўта-транспартных і іншых гаспадарчых арганізацый, у якіх яны працуюць.

Нам. Наркамправ працы БССР Захарава.

Ст. Інспэктар па кадрам Коньнікаў.

ПАПРАЎКА

У газэце „Савецкая Беларусь", у № 11 ад 13 студзеня 1931 г., у пастанове НК Працы БССР—2—у артыкуле № 17 надрукавана:

НАДРУКАВАНА:

„Уся работа на праваздзеньні ў жыцьцё гэтай пастановы павінна быць скончана да 1-га студзеня 1931 г."

ЧЫТАЦЬ:

„Уся абота па праваздзеньні ў жыцьцё гэтай пастановы павінна б ць скончана да 1-га л ю т а г а 1931 г."

Ст. інспэктар НК Працы БССР САКОЛЬЧЫК.

Рэдакцыі газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

патрэбны МАШЫНІСТКІ,

якія добра ведаюць беларускую мову

ЗЬВЯРТАЦЦА ДА СЭКРАТАРА РЭДАКЦЫІ. ТЭЛ. № 4-78

ПРЫ СЛУЦКІМ ПЭДТЭХНІКУМЕ

АДЧЫНЯЮЦЦА

6-МЕСЯЧНЫЯ НАСТАЎНІЦКІЯ КУРСЫ

Падрыхтоўка—самігодна ці школа рэпэтыцый на абхвату ведаў у асноўным.

ДАКУМЭНТЫ: анкета аб сацыяльным становішчы аб асьвеце аб праве голасу і мэтрычная справука.

Заявы прымаюцца да 25 I—1931 г. Пачатак заняткаў 5-II—1931 г.

55 проц. забясьпечваюцца стыпэндыямі па 27 руб. у месяц.

ЗГУБЛЕНЫ

Асабовае пасьведчаньне № 544 Бандарэнка Ц. выд. Горскім с-с кв. 1345-п.

Кніжка на імя №10730 Дзянісава П. Т. выдан. Горацкім РВК кв. 1345-п.

Членская кніжка Чэхава Е. А. выдан. Горацкім Прац. зямлі і лесу кв. 1345-п.

Картка на імя Фаерман З. М. вы